Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 43 (3947)
СУБОТА, 14 ЛЮТАГА 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Ільназагатоўкі—фронт клясавай барацьбы

Папярэднія весткі аб выніках першай пяцідневкі двухдэкадніка штурму прарываў па ільназагатоўках сьведчаць аб тым, што ніякага штурму па ільназагатоўках у сапраўднасьці не пачалося. Ганебныя тэмпы мінулай пяцідневкі 1—5-га лютага ня толькі не застапіся ззаду, але-ж загатоўкі апошняй пяцідневкі навет не дасягнулі ўзроўню мінулай: калі ў першую пяцідневку лютага загатоўлена 300 тон, дык у другую пяцідневку загатоўлена толькі 283 тоны.

Спажывецкая кааперацыя загатовіла ў апошнюю пяцідневку значна менш, чым за час ад 1-га да 5-га лютага. Спажывецкая кааперацыя навет ня здолела сьледаць за чарепашымі тэмпамі сельска-гаспадарчай кааперацыі.

Характэрным для першай пяцідневкі штурму зьяўляецца тое, што толькі НЕКАТОРЫЯ арганізацыі пераключыліся на баявыя тэмпы.

Так, напрыклад, МЕЖАНСКІ раён, які за ўвесь час ільназагатовак загатовіў толькі 112 тон — у першую пяцідневку штурму даў 40 тон па аднэй толькі сельска-гаспадарчай кааперацыі. Боркавічы загатовілі 27 тон. Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што ў ГЭТЫХ РАЁНАХ ПАЧАЎСЯ ПЕРАЛОМ. Весткі з Межына і Боркавіч, пацьвярджаюць што справа не ў «аб'ектыўных прычынах», а ва ўменьні мабілізаваць партыйна-камсамольскую арганізацыю, бядняка-сераднякцкія і калгасныя масы на выкананьне гэтага важнейшага гаспадарча-палітычнага заданьня.

Дзе-ж прычыны зрыву пляну ільназагатовак па большасьці раёнаў? На гэта пытаньне дае зусім яскравы адказ тав. КАЛНІН у сваім выступленьні на завочным мітынгу-перакліччы па ільназагатоўках. Тав. Калнін адзначыў, што «ня ўсе партыйныя арганізацыі ўразумелі клясавы характар і палітычнае значэньне барацьбы за лён».

Правеапартуністычная недаацэнка ільназагатовак, недаацэнка клясавай барацьбы, ва ўмовах якой адбываюцца ільназагатоўкі, лёгкае дзяляцтва—зьяўляюцца асноўнымі прычынамі прарываў на ільназагатоўчым фронце.

Чым, калі не макровым правым апартунізмам трэба канфіскаваць факт недавядзеньня цьвёрдых заданьняў да 5-7 проц. кулацка-заможных гаспадарак?

Чым, калі не патураньнем кулаку можна кваліфікаваць тое, што сурскія раённыя арганізацыі далі цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам толькі ў разьмеры 6,2 проц. агульнага заданьня?

Па шляху патураньня кулаку, здачы яму пазыцый на ільназагатоўчым фронце пайшоў рад раённых арганізацый, якія, як у адносінах да колькасьці гаспадарак, так і да ўдзельнай вагі кулацка-заможных гаспадарак у выкананьні пляну ільназагатовак, ігнаравалі выразную дырэктыву ЦК КП(б)Б і СНК.

ТРЭБА ПРОСТА ЗАЯВІЦЬ: ТАМ, ДЗЕ КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫЯ ГАСПАДАРКІ НЕ АТРЫМАЛІ САПРАЎДЫ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ, ТАМ, ДЗЕ КУЛАЦКА-ЗАМОЖНАЯ ВЯРХУШКА ВЁСКІ МОЖНА БЯСКАРНА САБАТАВАЦЬ ЗДАЧУ ІЛЬНУ, — ТАМ НЕ ЗАБЯСПЕЧАНА БАЛЬШАВІЦКАЕ КІРАЎНІЦТВА РАЁННАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, ТАМ КІРАЎНІКІ РАЁНАЎ АПЫНУЛІСЯ Ў ПАЛОНЕ МАХРОВАГА ПРАВАГА АПАРТУНІЗМУ.

Досыць дырэктыў аб давядзеньні цьвёрдых заданьняў і іх спагнаньні! Хто іх да гэтага часу ня выканаў, хто пічыць цьвёрдым заданьнем для кулацка-заможных гаспадарак 4-8 проц. агульнага пляну загатовак, той проста НЕ ЖАДАЕ выконваць дырэктыў партыі, той не разумее генэральнай лініі нашай партыі.

Аб гэтым зусім яскравым папітычным вываўзе павінны падумаць райкомы і райвыканкомам Чачэвіцкага, Сураскага, Ветрынскага, Жлобінскага, Глускага, Гомельскага, Грэскага, Кармянскага, Круглянскага і іншых раёнаў, якія ўвесь час цягнуцца ў хвасьце.

ГАНЕБНАЯ ЛІЧБА — З КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫХ ГАСПАДАРАК СПАГНАНА ТОЛЬКІ 30-35 ПРОЦ. ВЫЗНАЧАНАГА НА ІХ ПА ПЛЯНЕ ІЛЬНУ.

Першай задачай нашых раённых арганізацый — гэта праверыць і яшчэ раз праверыць на працягу бліжэйшых-жа дзён, ці даведзены цьвёрдыя заданьні да ўсіх кулацка-заможных гаспадарак, ці зьяўляюцца гэтыя заданьні сапраўды цьвёрдымі, ці спагнаны яны поўнасьцю ад кулака і заможніка. Толькі большавіцкі націск на кулака, толькі руйнуючы адпор кулаку — сабатажніку забясьпечаць 100-процантнае спагнаньне цьвёрдых заданьняў ад кулацка-заможных гаспадарак.

Вельмі важнай задачай зьяўляецца таксама спагнаньне ільну па кантрактацыйных умовах. Кулак імкнецца ўсімі мерамі сарваць кантрактацыю ільну на 1931 г. Адным з яго манэўраў на гэтым шляху зьяўляецца арганізацыя сабатажу здачы ільну па старых кантрактацыйных умовах. Сарваць гэты плян кулака — вось наша задача. Таму — намагчы ўсе сілы, каб сабрать увесь лён па кантрактацыйных умовах. Праяўленьне ўсякага лібэралізму ў адносінах да злоснага парушыцеля кантрактацыйнай умовы — правы апартунізм на практыцы, дапамога кулаку.

Наша задача на чым-бы ні стала ў бліжэйшыя дні закончыць апрацоўку ільну ў калгасах. АПАРТУНІСТЫ НЕ РАЗУМЕЮЦЬ, АЛЬБО НЕ ЖАДАЮЦЬ РАЗУМЕЦЬ, ШТО МАРУДНЫЯ ТЭМПЫ АПРАЦОЎКІ І ЗДАЧЫ ІЛЬНУ КАЛГАСАМІ ЗЬЯВЯЦЦА БЯССПРЭЧНЫМ ТОРМАЗАМ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ПРАГРАМЫ СЯЎБЫ ІЛЬНУ КАЛГАСАМІ Ў ДРУГУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ ВЯСНУ. НА 20-ГА ЛЮТАГА НІВОДНАГА КІЛЕ НЕАПРАЦАВАНАГА І НЯЗДАНАГА ІЛЬНУ Ў КАЛГАСАХ — вось той пёзунг, пад якім павінна быць неадкладна арганізавана сацспаборніцтва паміж калгасамі.

Раённыя арганізацыі павінны праверыць наколькі ажыцьцяўляецца пастанова ЦКК і дырэктыва ўраду аб ПРЭМІЯВАНЬНІ КАЛГАСЬНІКАЎ, ЯКІЯ ЗАЙМАЮЦЦА АПРАЦОЎКАЙ ІЛЬНУ.

Значна ўзмацніць працу па загатоўцы ільну ад бядняцка-сераднякцкіх гаспадарак у парадку самаабавязацельстваў — важнейшая задача. Толькі мабілізацыя бядняцка-сераднякцкіх мас на 100-процантнае выкананьне ільназагатовак забясьпечыць выяўленьне кулацка-заможных гаспадарак, спагнаньне ад іх ільну. Толькі шляхам масавай работы сярод бядняцка-сераднякцкай і калгаснай часткі вёскі мы дабіемся поўнага атрыманьня ільну па кантрактацыйных умовах, як ад аднаасобнікаў, — так і ад калгасаў.

Двухдэкаднік штурму павінен быў стварыць пералом. Але-ж першыя весткі сьведчаць аб тым, што «апартунізм у ільназагатоўках пакуль што ня выкарчаваны, што бязьдзейнасьць і чыноўнічая благадушнасьць працягваюцца» (з выступленьня тав. Калніна).

Рад раённых арганізацый яўна сабатавалі правядзеньне двухдэкадніка. Аб гэтым сьведчыць тэлеграма брыгады ЦКК з Жлобіна, аб гэтым яшчэ больш красамоўна гаворыць тэлеграма с.-г. каапэрацыі з Жлобіна аб тым, што за апошнюю пяцідневку «ільну не загатоўлена».

ГЭТЫ САБАТАЖ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ ПА ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ НЯ МОЖА ЗАСТАЦЦА БЯСКАРНЫМ. ЗУСІМ ПРАВІЛЬНЫМ ТАМУ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЗАЯВА ТАВ. КАЛНІНА, ШТО ПРЭЗЫДЫУМ ЦКК ПАСТАВІЦЬ ПЫТАНЬНЕ АБ РОСПУСКУ Б�ЮРО ЖЛОБІНСКАГА І ПАРЫЦКАГА РАЙКОМАЎ КП(б)Б, ЯКІЯ ПА ЛІНІІ С.-Г. КААПЭРАЦЫІ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ І ПРАВАЛЬВАЮЦЬ ДВУХДЭКАДНІК ШТУМУ.

Барацьба з канкрэтнымі носьбітамі правага апартунізму ў ільназагатоўках, бязьлітасны адпор апартуністам усіх копераў на гэтым важнейшым палітычна-гаспадарчым вучастку — зьяўляюцца першай умовай пасьпяховага выкананьня пляну ільназагатовак. Таму задача партыйных арганізацый, у першую чаргу кантрольных камісій, праверыць, хто зьяўляецца канкрэтным віноўнікам у зрыве дырэктыў партыі. ЧАС ПЕРАЙСЬЦІ АД АГУЛЬНЫХ ФРАЗ АБ ЗРЫВЕ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ ДА БАЛЬШАВІЦКАГА І СЬМЕЛАГА ВЫКРЫЦЬЦЯ АПАРТУНІСТАЎ, БЮРАКРАТАЎ І ШКОДНІКАЎ, ЯКІЯ СУМЕСНА З КУЛАКОМ АРГАНІЗОЎВАЮЦЬ ГЭТЫ ЗРЫЎ.

Партыйныя арганізацыі Беларусі не дапусьцяць, каб з-за недадачы ільну Івана-Вазьнясенску, Арэхава-Зуеву, затармазілася-б разгортваньне нашай тэкстыльнай прамысловасьці. У партыйных арганізацый ёсьць даволі сіл, каб не дапусьціць гэтага. Гэта пацьвердзіла пасьпяхова праведзеная загатоўка бульбы і рад іншых палітычна-гаспадарчых заданьняў. СПРАВА ТОЛЬКІ ВА ЎМЕЛАЙ РАССТАНОЎЦЫ І ПРАВІЛЬНЫМ СКАРЫСТОЎВАНЬНІ СІЛ РАЁННЫХ І ГАРАДСКІХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

Пакончыўшы з апартуністычным хныканьнем, з бязьдзейнасьцю і чыноўнічай благадушнасьцю ў ільназагатоўках, даючы руйнуючы адпор кулаку і яго агентуры ўнутры нашае партыі, пераключыўшыся на сапраўды ўдарныя тэмпы і мэтады працы, наша КП(б)Б закончыць бальшавіцкі бой за лён перамогай.

В. ШАРАНГОВІЧ

За пералом у падрыхтоўцы да другой калгаснай вясны

Веснавая пасеўная кампанія 1931 году зьяўляецца важнейшай часткай выкананьня трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Поўнасьцю выканаць пляны вясновай сяўбы — гэта значыць у значнай меры вырашыць задачу выкананьня трэцяга году пяцігодкі. Студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б да пытаньняў веснавой сяўбы падыйшоў з усёй бальшавіцкай сур'ёзнасьцю і прапануе: «...партарганізацыям і ўсім арганізацыям, ад якіх залежыць выкананьне пляну веснавой сяўбы—на працягу бліжэйшых дзён (падкрэсьлена намі) стварыць рашучы пералом у падрыхтоўчай рабоце і абавязвае ўсе партарганізацыі пачаць зараз-жа масавую падрыхтоўчую работу да веснавой сяўбы, падначаліўшы яе задачам арганізацыі масавага прыліву аднаасобнікаў у калгасы і стварэньню новых калгасаў».

Мінулі ня толькі дні, мінулі—дэкады. Мы ня маем ніякай падстаны лічыць, што ўсе арганізацыі аднесьліся з усёй сур'ёзнасьцю да дырэктыў пленуму і да задач веснавой сяўбы. Ёсьць асобныя выключэньні, але сапраўднага перапому ў падрыхтоўцы да сяўбы яшчэ няма. Тэмпы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы яшчэ такія, што не забясьпечваюць выкананьня намечаных для веснавой сяўбы задач, а гэта значыць і ажыцьцяўленьня ўсёй праграмы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

З усіх слабых вучасткаў на сёнешні дзень досыць рэльефна вызначаюцца такія вучасткі, якія зьяўляюцца найбольш рашаючымі.

Вось лічбы і факты

Пляны веснавой сяўбы даведзены на 1-е лютага толькі да 49 проц. калгасаў і да 35 проц. аднаасобных бядняцка-сераднякцкіх гаспадарак.

Найбольш награжаючае становішча ў галіне стварэньня насенных і страхавых фондаў і ў загатоўках насеньня. Зусім незабясьпечана такая важнейшая справа, як падрыхтоўка насеньня траў (г. зн. —ставіцца пад пагрозу зрыву вырашэньне кармавой праблемы) і гародных культур (г. зн. ёсьць пагроза зрыву разгортваньня прыгарадных гаспадарак і адсюль удар па рабочым забясьпачэньні). Нічым іншым, як праявамі правага апартунізму на практыцы, зьяўляецца тое, што не даведзены цьвёрдыя заданьні на загатоўках насеньня да кулацкіх гаспадарак.

Найбольш шкоднае ў справе загатовак насеньня — гэта арыентацыя шмат якіх раёнаў на завоз насеньня і адсюль настроі самацёку—«калі не загатовім насеньня — значыць прывязуць». Вось чаму процанты выкананьня пляну ў гэтай галіне вымяраюцца такімі лічбамі, як 1-5.

Работа па давядзеньні пляну да калгасаў і ў парадку самаабавязацельстваў да бядняцка-сераднякцкіх гаспадарак ня ўвязваецца з тым, наколькі прынятая на пляне пасеўная плошча забясьпечана абсемяненьнем.

З адсталых раёнаў мы асабліва падкрэсьліваем такія раёны, як Гарадоцкі, Межа[illegible] Шанковіцкі, Багушэўскі, Дуброўенскі, Капыльскі, Старадарожскі, Церахоўскі, Расонскі і Ўваравіцкі. У гэтых раёнах мы маем найбольш нізкія паказчыкі работы на падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і таму гэтым раёнам трэба раней ад усіх падцягнуцца.

Зусім нездавальняючае становішча з рэмонтам трактараў і прасоўваньнем с.-г. машын і мінэральнага ўгнаеньня. У гэтай справе пануюць самыя яскравыя права-апартуністычныя тэмпы работы.

Усе адзначаныя прарывы з усёй відавочнасьцю сыгналізуюць аб тым, што, калі, літаральна ў працягу бліжэйшых дзён, ня будзе створан рашучы пералом і ня будуць узяты сапраўды бальшавіцкія тэмпы, мы рызыкуем праваліць справу падрыхтоўкі веснавой сяўбы, якая мае такое важнейшае і рашаючае значэньне ў агульным пляне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Дзе прычыны такога становішча?

Прычыны ляжаць у тым, што ў значнай частцы партыйных, загатоўчых і машына-забясьпечваючых арганізацый існуе права-апартуністычная бязьдзейнасьць, што Белсельгасснаб, Калгасцэнтр і ўсе сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі бальшавіцкай веснавой кампаніі. Яшчэ няма дастатковай рухомасьці, апэрацыйнасьці і ўменьня на кожным канкрэтным адрэзку часу брацца за асноўнае рашаючае зьвяно ў рабоце Наркамзему і іншых установаў, зьвяно, якое павінна цягнуць за сабой усю справу падрыхтоўкі веснавой сяўбы.

Няма ніякага апраўданьня і аб'ектыўных прычын таму, што стварылася. Ёсьць прычыны суб'ектыўныя, ёсьць праявы правага апартунізму па практыцы, па якіх трэба ўдарыць з усёй бальшавіцкай рашучасьцю і непрымірымасьцю.

Трэба рашуча перабудаваць усю работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, узяць сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы з тым, каб на працягу бліжэйшага часу быць «во всеоружии» да веснавой сяўбы. Ва ўсёй практычнай дзейнасьці трэба забясьпечыць строгую пэрсанальную адказнасьць кожнага працаўніка за выконваемую работу і наладзіць кантроль за выкананьнем дырэктыў.

У сучасны момант трэба стварыць рашучы пералом у загатоўках насеньня (асабліва траў і гародных культур), у засыпцы, насенных і страхавых фондаў. Тэрміны, устаноўленыя для правядзеньня гэтай работы, канчаюцца. Неабходна арганізаваць дэкаду масавай праверкі стварэньня насенных фондаў, увязаўшы гэта са сканчэньнем загатовак і стварэньнем фондаў. Ніякіх адтэрміноваваньняў і навольнасьцей!

У сувязі з гэтым трэба паставіць пытаньне аб рабоце загатоўчых арганізацый. Трэба прызнаць, што дзейнасьць гэтых арганізацый ня можа быць прызнана здавальняючай і што гэта ёсьць адна з першых прычын невыкананьня ў тэрмін пляновых мерапрыемстваў. Перабудаваць работу загатоўчых арганізацый, зараз-жа і рашуча выкарчаваць права-апартуністычную практыку ў іх рабоце—вось важнейшая задача.

Органы забясьпячэньня машынамі і мінэральным угнаеньнем больш за ўсё павінны несьці адказнасьць за тое што машыны і мінэральныя ўгнаеньні прасоўваюцца выключна марудным тэмпамі. Трэба гэтым арганізацыям рашуча падцягнуцца. Уся пралетарская грамадзкасьць, друк, камсамол са сваёй «лёгкай кавалерыяй» — няхай возьмуцца за праверку складаў машын. Трэба выясьніць прычыны залежаў машын і ўгнаеньняў, выкрыць канкрэтных віноўнікаў, рашуча зьнішчыць гэтыя прычыны і забясьпечыць чоткае і бесьперабойнае прасоўваньне машын і ўгнаеньня да калгасаў. Райкомы павінны ўсю гэтую работу ўзяць пад свой асобны кантроль.

Але справа ня толькі ў прасоўваньні машын, а і ў іх рамонце. Лічбы выкананьня пляну па рамонце паказваюць на небясьпеку ў гэтай справе. Прафарганізацыі, райкомы, ячэйкі і шэфскія арганізацыі павінны рамонту сельска-гаспадарчых машын надаць таксама баявы характар.

Некалькі слоў аб цэнтральных і раённых газэтах. Нельга сказаць, што нашы газэты ў поўнай меры адыгрываюць сваю важнейшую ролю ў справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Справа ня толькі ў колькасьці зьмяшчаемага матар'ялу (якога, да рэчы, таксама недастаткова), але галоўнае ў тым, каб, акрамя зьмяшчаемых зводак, у кожным нумары і на кожныя некалькі дзён выбіраць галоўнае, рашуча выкрываць прычыны прарываў, своячасова папярэджваць іх і з усёй рашучасьцю біць па права-апартуністычнай бязьдзейнасьці. Бальшавіцкія тэмпы падрыхтоўкі сяўбы павінны быць ня толькі ў рабоце партыйных арганізацый, але і ў газэтах.

Мы ня спыняемся на радзе іншых важнейшых вучасткаў работы, якія знайшлі належную ацэнку і паказаньні ў адпаведных пастановах ЦК КП(б)Б. Галоўнае зараз—гэта больш актыўна ўзяцца за рашаючыя вучасткі работы і павялічыць у некалькі разоў тэмпы падрыхтоўкі ды сяўбы. Мы падкрэсьліваем пытаньне аб тэмпах, бо гэта рашае тое, наколькі мы зможам выканаць намечаныя задачы.

Надыходзячая веснавая сяўба павінна зьявіцца калгаснай сяўбой. У рашучай барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі і ў першую чаргу з правым апартунізмам—мы павінны ў веснавую сяўбу 30 проц. бядняцка-сераднякцкіх гаспадарак аб'яднаць у калгасы. Гэта задача кожнага камуніста і камсамольца ва ўсёй рабоце па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Ганебнейшая справа ў Капыльшчыне

„ПРАЦЭС 167-мі"—НЕ БЮРАКРАТЫЗМ, А ПРАВАКАЦЫЙНАЯ ВЫЛАЗКА КЛЯСАВАГА ВОРАГА

Пракуратура рэспублікі павінна зараз-жа зацікавіцца гэтай справай

КАПЫЛЬ. (Брыгада «Зьвязды»). Аб тым, як Капыльскі раён адгукнуўся на гістарычную адозву партыі і ўраду аб кантрактацыі, ужо паведамлялася ў «Зьвязьдзе». Мясцовыя работнікі, прачытаўшы адозву партыі і ўраду аб кантрактацыі (а хто і зусім ня чытаў) парашылі, што гэтым іх місія скончана. Да прапрацоўкі адозвы сярод мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў тут не прыступалі, чакаючы... невядома чаго.

Затрыманьне з папулярызацыяй адозвы аб кантрактацыі, аказваецца мае ў Капыльскім раёне свае спэцыфічныя прычыны, якія вельмі яркa характарызуюць, як некаторыя мясцовыя арганізацыі разумеюць і праводзяць (пад бокам раённага кіраўніцтва) важнейшыя дырэктывы партыі аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Гэтымі днямі ў Капылі адбыўся судовы працэс над 167 аднаасобнікамі—беднякамі і сераднякамі. Падсудныя абвінавачваліся ў тым, што яны, быццам, ня выканалі дагавору аб кантрактацыі ў іх сьвіней менскім аддзяленьнем Белдзяржгандлю. Такая нячуваная ў савецкіх умовах справа зьявілася вынікам выключнага бюракратызму і цяганіны з боку загатоўчага апарату Белдзяржгандлю ў Капылі ў асобе ўпаўнаважанага **Энціна** і агентаў **Бохана** і **Кароткага**. Справа ўзьнікла 1 студзеня 1931 году: у сувязі з ліквідацыяй мясцовага аддзяленьня Белдзяржгандлю ўпаўнаважаны Энцін зьвярнуўся ў нарсуд з просьбай прыцягнуць 167 сялян да судовай адказнасьці за невыкананьне імі дагавароў па кантрактацыі, заключаных у 1929 г.

Суд назначыў слуханьнем справу на 12 студзеня. У гэты дзень у капыльскі суд з розных канцоў раёну прышлі ўсе адказчыкі—167 сялян бедняко ў і сераднякоў. Не зьявіўся толькі ўпаўнаважаны **Энцін**, які пражывае ў Капылі, і суд... быў адкладзен. 167 сялян страцілі 167 рабочых дзён і дарэмна прайшлі на марозе некалькі соцень кілёмэтраў. Энцін прыслаў у суд запіску, у якой пісаў:

«У сувязі з заблытанасьцю справы, прашу суд адкласьці, пры гэтым прыкладаю сьпіс 15, сялян, якія па памылцы былі занесены ў сьпіс абвінавачаных».

На 6 лютага слуханьне справы было прызначана ў другі раз. Зноў зьявіліся ўсе адказчыкі і сьведкі. Абураныя сяляне хваляваліся, не разумеючы ў чым справа, за што іх цягнуць на судох.

На гэты раз у суд прышоў і Энцін, падаўшы чарговы сьпіс 49 сялян, «па мылкова адданых пад суд».

На судзе высьветлілася, што для прыцягненьня да судовай адказнасьці амаль паловы падсудных ня было абсалютна ніякіх, навет фармальных, падстаў. Частка абвінавачаных даўно выканала свае абавязкі, здала сьвіней і мае квітанцыі. Многія ўжо вярнулі авансы таму, што сьвіньні падохлі ад чумы, што дакументальна пацьвярджана.

На допыце сяляне паказалі, што сьвіней яны здавалі Энціну і яго агентам. Ім-жа варочаліся авансы за здохлых сьвіней. Энцін атрымліваў грошы, дзе папала: на дарозе, рынку і г. д., але квітанцый сялянам не даваў.

Былі і такія выпадкі. Сяляне прывозілі здаваць сьвіней Энціну, а ён адсылаў іх назад за 20 вёрст, кажучы: «Сёньня я ня прымаю, прывязеце 18-га». У выніку рад выпадкаў падзяку сьвіней пры такіх «сустрэчных» перавозках.

Асаблівай увагі заслугоўвае драктыка работы бухгальтэрыі менскага аддзяленьня Белдзяржгандлю. Яна, як правіла, акругляла лічбы. Калі селянін-бядняк павінен быў заплаціць няўстойку 16 р. з капейкамі, бухгальтэрыя вылічвала з яго 20 руб., калі 27 руб.—30 руб. Такім чынам, пры кантрактацыі трох сьвіней селяніну прыходзілася плаціць лішніх 11 рублёў.

Селянін А. Мароз адданы пад суд за тое, што ён не вярнуў авансу ў 5 р. 50 к. На судзе Мароз прад'явіў квітанцыю аб здачы агенту Бохану 6 р. замест патрэбных 5 р. 50 к. За тое, што Бохан вінен селяніну 50 кап., апошняга цягнуць 2 разы ў суд і патрабуюць, каб ён другі раз заплаціў 5 р. 50 к.

Яшчэ адзін факт. 5 сялян кантрактавалі па тры сьвіньні і атрымалі авансы па 60 руб.—па 20 р. за штуку. Сьвіньні падохлі ад чумы. Акты паданы ў менскае аддзяленьне Белдзяржгандлю. Сяляне павінны былі вярнуць атрыманыя авансы на 60 р. кожны (аб чым яны самі заявілі па судзе), а па бухгальтэрыі за імі лічылася толькі па 40 рублёў.

Яркі прыклад. Адзін з адказчыкаў здаў закантрактаваную сьвіньню своячасова. На дагаворы была рэзалюцыя аб выдачы прэміі. Замест выдачы прэміі гэтага селяніна прыцягнулі да судовай адказнасьці за... нездачу сьвіней, патрабавалі з яго 20 руб. авансу і выплаты 20 руб. няўстойкі.

Такая «віна» 164 абвінавачаных з ліку 167.

Капыльскі нарсуд пастанавіў: за бюракратызм і цяганіну аддаць пад суд вінаватых у гэтай справе—упаўнаважанага Энціна, агентаў Бохана і Кароткага, работнікаў менаддзяленьня і камісію Белдзяржгандлю па ліквідацыі капыльскага аддзяленьня.

Клюйко, Фрыд, Цімафеенка.

***

Сёньня мы друкуем матар'ялы брыгады «Зьвязды» па ганебнейшай справе ў Капыльскім раёне. Ганебнай таму, што цяжка прыдумаць што-небудзь больш бяздушнае і бюракратычнае, у корані скрыўляючае лінію партыі, чым гэты «працэс» над 167 сялянамі-беднякамі і сераднякамі. ТУТ МЫ МАЕМ СПРАВУ З САМЫМ ЗЛОСНЫМ СКАЖЭНЬНЕМ УСІХ АСНОЎНЫХ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ І САВЕЦКАЙ УЛАДЫ, ЯЎНАЙ АНТЫСАВЕЦКАЙ ПРАВАКАЦЫЯЙ, АРГАНІЗАВАНАЙ АГЕНТАМІ КЛЯСАВАГА ВОРАГА.

Тут кельга АБМЕЖАВАЦЦА ВЫЯЎЛЕНЬНЕМ ГЭТАЙ «СПРАВЫ», як праяўленьня выключнага, ганебнага бюракратызму. Ідэя «масавага працэсу», што нарадзілася ў галавах шкоднікаў, яўна накіравана да падрыву саюзу рабочай клясы з сераднякамі і грае на руку кулаку. Як маглі Энцін, Бохан і Кароткі аказацца на адказнейшай рабоце ў савецкім апараце? ДЗЕ БЫЛО ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА КАПЫЛЬСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ, калі пад бокам у яго арганізоўваўся і адбываўся недарэчны «працэс», які па сутнасьці накіраваны супроць мерапрыемстваў партыі і савецкай улады па кантрактацыі яравых культур у 1931 г. У сваім прыгаворы народны суд на страцію клясавага чуцьця, але, як змог ён прыняць да разбору і слухаць гэту справу, калі, ужо паводле папярэдніх матар'ялаў, быў выразна відаць праваакцыйны, антысавецкі характар гэтага працэсу.

Мы патрабуем, каб органы пракурорскага нагляду неадкладна расьсьледвалі гэты ганебнейшы факт. Мы патрабуем выразнага адказу і дакладных тлумачэньняў ад Капыльскага РК КП(б)Б; як гэта магло здарыцца і дзе была партыйная арганізацыя?

Трэба з усёй рашучасьцю вынырваць апартуністаў—удзельнікаў складаньня гэтага працэсу.

Мы пытаемся ў Белдзяржгандлю, ці вядомы яму гэты факт, як ён на яго рэагаваў і якім чынам здарылася, што падобныя «работнікі» аказаліся ў яго апараце?

***

КАПЫЛЬ. (Па тэлефону 14 лютага, 0.50 хвілін).

Райком партыі зусім не рэагаваў на гэту справу. Ніякай ацэнкі і пастановы на гэтым пытаньні ня было з боку райкому партыі. Упаўнаважаны Наркамгандлю Энцін **ня прыцягнут да партыйнай адказнасьці** і скарыстоўваецца на рабоце ў тых-жа сельсаветах, у якіх судзілі сялян. Ніякіх мер ня ўжыта па правядзеньні растлумачальнай работы сярод сялян аб шкодніцтве работнікаў Наркамгандлю. Па справе суда не мабілізаваны ні кіруючыя раённыя арганізацыі, ні грамадзкасьць Капыльшчыны. **Гэту справу скарыстоўвае кулак для агітацыі супроць кантрактацыі. Ячэйкі не праводзяць адпаведнай работы сярод сялян, яны ня маюць указаньняў з РК.**

Сяляне кажуць, што «лепш я свой лішак з гаспадаркі аддам дзяржаве без кантрактацыі, дык мяне нікуды ня будуць цягаць».

ДА ГЭТАГА ЧАСУ АДОЗВА ЦК АБ КАНТРАКТАЦЫІ НЕ РАСПРАЦОЎВАЕЦЦА НІ КАЛГАСАМІ, НІ СЯРОД БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС ВЁСКІ. Агідная апартуністычная дзейнасьць у справе кантрактацыі паглядаецца да гэтага часу. Справу гэту ведала **таксама і раённая кантрольная камісія** і не падала гэтаму фактуніякага значэньняў той час, калі старшыня РВК пасьля першага суда 12 студзеня пісаў адносіну РКК аб прыцягненьні да адказнасьці Энціна.

Газэта «Калгасьнік Капыльшчыны», орган РК і РВК да гэтага часу не рэагавала на гэту контр-рэвалюцыйную работу агентаў клясавага ворага, ведаючы сутнасьць гэтай справы. З моманту першага суда—12 студзеня—выйшлі два нумары газэты, а з часу апошняга суда газэта зусім ня выходзіла.

Брыгада «Зьвязды» і «Праўды»
Фрыд, Клейко.

15.000 камсамольцаў на правядзеньне кантрактацыі

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ

Адозва ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, СНК СССР і БССР аб кантрактацыі яравых пасеваў у 1931 г. мае выключна важнае гаспадарча-палітычнае значэньне. Кантрактацыя павінна стаць адным з важнейшых вагароў пасьпяховага правядзеньня другой бальшавіцкай вясны і выклікаць новую, яшчэ больш магутную, хвалю калгаснага руху, яшчэ большае згуртаваньне бядняцка-сераднякцкіх мас вёскі па рашучую барацьбу з кулацтвам, ліквідуючы яго як клясу на базе суцэльнай калектывізацыі.

Укладаньне ў сельскую гаспадарку дзяржаўных сродкаў на 26,5 млн. руб. сель.-гас. машынамі і 161.600 тон мінэральных угнаеньняў дасьць сельска-гаспадарчаму сэктару непамернае павялічэньне сродкаў вытворчасьці, больш чым у мінулым годзе. Дзеля гэтага высунутыя партыяй і ўрадам задачы кантрактаваць 460.000 га збожжавых культур, 120.000 га ільну, 28.000 га канапель, 120.000 га бульбы, 8.500 га гароднины і 8.500 га садавіны і рад іншых культур абавязваюць ЛКСМБ неадкладна ўключыць усе зьвенні саюзу для мабілізацыі калгасьнікаў і бядняка-сераднякцкіх мас на пасьпяховае і поўнае выкананьне пляну кантрактацыі.

Выходзячы з гэтага, ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1) Райкомам і ячэйкам зараз-жа разгарнуць масавую растлумачальную працу сярод камсамольцаў, калгасьнікаў і бядняцка-сераднякцкіх мас вёскі аб гаспадарча-палітычным значэньні адозвы ЦК і СНК. На працягу лютага м-ца, разам з давядзеньнем пляну веснавой сяўбы, давесьці пляновыя заданьні на кантрактацыі да калгасу, таварыства і паасобнага бядняцка-сераднякцкага двара, арганізаваўшы хвалю сустрэчных пляноў, дабіўшыся іх выкананьня і перавыкананьня.

2) Выкананьне пляну кантрактацыі павінна садзейнічаць найхутчэйшаму і пасьпяховаму правядзеньню веснавой сяўбы і спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі. Для гэтага РК і ячэйкі павінны забясьпечыць поўнае выкананьне пляну як па сяўбе, так і па кантрактацыі, асабліва па ільнавадкане, бульбе і збожжы, вядучы рашучую барацьбу з праваапартуністычнай практыкай, якая выяўляецца ў тэндэнцыі скараціць пляны пасеўнай плошчы і кантрактацыі.

3) Прасачыць за правільным правядзеньнем кантрактацыі, не дапускаючы ні ў якім разе якіх-бы там ні было скрыўленьняў, цьвёрда памятаючы, што ў гэтым годзе кантрактуецца значна большая плошча пасеваў, што здача кантрактаванай прадукцыі ў строга абмежаваныя тэрміны абавязвае камсамольскую арганізацыю яшчэ больш умацніць барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай кантрактацыі, змагацца за выразную і своячасовую работу ўсіх арганізацый, даючы рашучы адпор кулаку і яго агентам—правым апартуністам, якія будуць імкнуцца сарваць гэтае найважнейшае мерапрыемства партыі.

4) Праверыць і прыняць адпаведныя меры, пачынаючы ад цэнтральных і раённых устаноў і канчаючы сельсаветамі, па выкананьні імі дырэктывы партыі і ўраду аб своячасовым накіраваньні дзяржаўных сродкаў, прызначаных для разьвіцьця сельскае гаспадаркі, бо своячасовае прасоўваньне іх дасьць яшчэ большую магчымасьць выканаць своячасова і з посьпехам пляны кантрактацыі. Абавязаць зараз-жа ўсе РК і ячэйкі правесьці налёты «ЛК» на ўсе гэтыя ўстановы, з пункту погляду своячасовай рэалізацыі імі адозвы ЦК УсеКП(б), КП(б)Б, СНК СССР і БССР, мабілізаваўшы друк як цэнтральны, так і раённы для сыстэматычнай папулярызацыі правядзеньня кантрактацыі.

5) Арганізаваць ударную «сквазную» брыгаду пры ЦК, РК і ячэйках ЛКСМБ, якая на ўсёй БССР павінна ахапіць у агульнай колькасьці ня менш 15.000 камсамольцаў, непасрэдна працуючых па правядз

Самакрытыка—магутны сродак змаганьня за выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі

Апартуністаў і душыцеляў самакрытыкі беспаваротна гнаць з адказных вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва

„Наша задача заключаецца ў тым, каб ва ўсёй практычнай рабоце выкрываць правы ўхіл, выхоўваць на канкрэтных фактах найшырэйшыя партыйныя рабочыя масы ў духу ленінізму" (Кагановіч).

Барысаўская партарганізацыя, пад кіраўніцтвам ЦК, па-бальшавіцку выправіць прарывы і апартуністычныя памылкі свайго кіраўніцтва

ВУРОКІ БАРЫСАВА

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б выдае сваю пастанову аб становішчы ў Барысаўскай арганізацыі. Пастанова разам з тым, што адзначае посьпехі, якія мае Барысаўская арганізацыя ў справе ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, канстатуе на важнейшых вучастках работы рад буйнейшых прарываў, кваліфікуючы іх, як праяўленьне правага апартунізму. Адначасова ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове падкрэсьлівае наяўнасьць фактаў заціску самакрытыкі з боку кіраўніцтва раённай арганізацыі і зобіць адсюль адпаведныя арганізацыйныя вывады.

Задача Барысаўскай арганізацыі—ды ня толькі Барысаўскай, а і ўсіх астатніх раённых арганізацый КП(б)Б—зрабіць з усіх фактаў і палітычных прарываў Барысаўскай арганізацыі належны палітычны вурок. Буйныя памылкі кіраўніцтва Барысаўскай партарганізацыі павінны быць улічаны ўсімі райпартарганізацыямі і паслужыць прыкладам, як ня трэба ставіць пытаньня аб разгортваньні самакрытыкі, аб змаганьні за генэральную лінію партыі, як ня трэба ставіць пытаньня аб мабілізацыі партыйных мас на ліквідацыю палітычных прарываў.

У чым сутнасьць Барысаўскай справы? Якія памылкі зрабіла кіраўніцтва Барысаўскай арганізацыі?

Першая памылка заключаецца ў тым, што райпарткіраўніцтва пры рэагаваньні на сыгнал «Зьвязды», паданы допісам «Трывожны сыгнал з Барысава», ня ўлічыла настрояў мас шырокага партыйнага актыву. Гэта выразна адлюстравана ў пастанове пленуму райкому. Пастанова ў пытаньні ацэнкі лініі Бюро райкому дапусьціла глыбокую супярэчнасьць і поўную адарванасьць фактаў, якія ўскрыты карэспандэнцыяй «Зьвязды» і таварышамі, выступаўшымі на пленуме райкому, ад актыўнай дзейнасьці і работы раённага парткіраўніцтва. Аб гэтых памылках, дапушчаных на пленуме райкому, шмат гаварыць ня будзем. Аб іх досыць коўна сказалі ў нашым артыкуле «Замест самакрытыкі—самастрахоўка». Падкрэслім толькі, што ў кіраўніцтва, якое прызнала свае памылкі, не хапіла бальшавіцкай пасьлядоўнасьці тут-жа, на пленуме, зрабіць чарговы крок у бок неадкладнага выпраўленьня сваіх памылак, у бок іх жорсткай крытыкі. Нявыказаўшы натрабаваньняў мас партыйнага актыву, парткіраўніцтва Барысаўскай арганізацыі на пленуме райкому зрабіла буйную палітычную памылку ў тым, што ня выкрыла ва ўсёй паўнаце дапушчаных у арганізацыі прарываў і фактаў праваапартуністычнай практыкі, а наадварот, замазала іх супярэчлівым і блытаным зьместам сваёй рэзалюцыі. Гэта зусім правільна падкрэсьліў Цэнтральны Камітэт у сваёй пастанове, пунктам аб тым, што «пленум РК у сваёй пастанове ад 28-30 студзеня ня ўскрыў з усёй рашучасьцю гэтыя прарывы і памылкі, а наадварот, трымяны на пленуме першы пункт рэзалюцыі іх замазвае».

«Зьвязда» вымушана была са свайго боку рэагаваць на гэту буйную палітычную памылку парткіраўніцтва Барысаўскага раёну. Выкрыўшы сутнасьць памылак, дапушчаных пленумам, «Зьвязда» заклікала ўсю Барысаўскую арганізацыю да неадкладнага выпраўленьня гэтых памылак праз бальшавіцкае разгортваньне самакрытыкі і мабілізацыю мас на змаганьне супроць усялякіх праяў правага апартунізму ў тэорыі і на практыцы. Кіраўнікі раённай арганізацыі, з Сасноўскім на чале, ня толькі ня прынялі ніякіх мер для выпраўленьня памылак, дапушчаных на пленуме, а нават паспрабавалі гэты, другі сыгнал «Зьвязды» прадставіць, як выступленьне ЦО КП(б)Б супроць усёй Барысаўскай арганізацыі. Гэта спроба была супраціўленьнем апартуністычнага кіраўніцтва выпраўленьню сваіх памылак, супраціўленьнем разгортваньню бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі, сродкам супроцьстаўіць арганізацыю—«Зьвязьдзе». Кіраўнікі Барысаўскай арганізацыі ня толькі нічога не зрабілі для выпраўленьня сваіх памылак, дапушчаных пры выпраўленьні сваіх папярэдніх памылак на пленуме, а нарабілі новых памылак. У даным выпадку работнікі райкому сваю ролю кіраўнікоў мас зьнялі да абаронцаў, да ролі ратавальнікаў «чести мундира» кіруючага партработніка. Усялякія «хожденія в массы» кіраўнікоў, апэляцыя да іх на ўстаноўкі друку ашчэ больш патыбілі і павялічылі зьмест і сутнасьць дапушчаных памылак. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваёй пастанове паказаў на гэтыя памылкі зусім выразна.

У пастанове ЦК КП(б)Б накопт гэтага гаворыцца:

«ЦК лічыць палітычнай памылкай РК вынесеньне на абмеркаваньне партыйных калектываў пытаньня аб пазыцыі партыйнага органаў друку да абмеркаваньня гэтага пытаньня ў ЦК».

І гэта зусім ясна. Як можна выступаць супроць тых, зусім правільных установак, якія давала партыйная прэса, у прыватнасьці «Зьвязда», як можна так зьяўна супраціўляцца разгортваньню самакрытыкі, груба ігнараваць і замазваць палітычную сутнасьць правільных сыгналаў і ўстановак органаў друку?

У сьвятле гэтага палажэньня абсалютна правільна паступіла «Зьвязда», калі ў сваім артыкуле «Пралетарская Барысаўская арганізацыя — бальшавіцкае кіраўніцтва» паставіла рэзка пытаньне аб кіраўнікоў арганізацыі. Гэтым артыкулам «Зьвязда» прымусіла апартуністаў і душыцеляў самакрытыкі хоць сёе-тое зразумець і яны, кіраўнікі Барысаўскай арганізацыі, пасьля гэтага спынілі сваю дзейнасьць, накіраваную на тое, каб супроць ставіць арганізацыю ўстаноўкам ЦО КП(б)Б—«Зьвязды». Пасьля гэтага артыкулу кіраўнікі Барысаўскага райкому, калі ня спынілі, то зьменшылі свае шуканьні апраўдаць уласныя апартуністычныя памылкі.

І, нарэшце, памылкі Барысаўскага парткіраўніцтва заключаюцца ў тым, што яно недапушчальна аднеслася да свайго друкаванага органу — газэты «Бальшавік Барысаўшчыны», якая, выходзячы з задач партыі і Барысаўскай арганізацыі, прымала ўсе меры да таго, каб правільна арыентаваць партыйныя масы, каб іх лепш мабілізаваць на разгортваньне самакрытыкі і выкарэньваньне праваапартуністычнай практыкі. Мы паўтараем сказанае намі ў ранейшых артыкулах аб тым, што «Бальшавік Барысаўшчыны» зрабіў зусім правільна, калі, побач з надрукаваньнем пленуму райкому, надрукаваў артыкул «Зьвязды», які даваў ацэнку работ пленуму. Мы падкрэсьліваем яшчэ раз, што «Бальшавік Барысаўшчыны» ва ўсёй сваёй рабоце вёў у асноўным правільную лінію. І тут асабліва абурацца тое, што раённае парткіраўніцтва прымусіла рэдакцыю надрукаваць яўна няправільныя і супярэчлівыя рэзалюцыі некаторых. Бюро парткалектыву аб пастанове пленуму РК і артыкулах «Зьвязды». Між іншым, гэтыя настановы блытаныя і супярэчлівыя выразна паказваюць на колькі кіраўнікі арганізацыі ўвялі ў заблуджэньне масы партыйнага актыву, наколькі няправільна іх інфармавалі аб работах пленуму райкому.

Гаворачы аб недапушчальных адносінах кіраўніцтва Барысаўскай арганізацыі да свайго друкаванага органу «Бальшавік Барысаўшчыны», мы ставім пытаньне, каб яно зьявілася вурокам для ўсіх раённых арганізацый, такога парадку: у якіх выпадках газэта, орган таго ці іншага райкому, можа выступіць супроць раённага кіраўніцтва.

Ні ў якім выпадку, калі гэта раённае кіраўніцтва праводзіць выразную лінію ў ажыцьцяўленьні палітычных задач партыі, калі гэта кіраўніцтва разам з усёй райпартарганізацыяй, з усёй партыйнай бязьлітасна змагаецца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, калі яно разгортвае сапраўды бальшавіцкую самакрытыку, калі яно рашуча выпраўляе свае пасобныя памылкі, дапушчаныя у барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва. Пры такім становішчы ні адна газэта ніколі ня можа выступіць супроць партыйнага кіраўніцтва, бо задачы партыйна-савецкага друку—задачы нашай партыі. І наадварот, партыйна-савецкі друк павінен мабілізаваць усе сілы на дапамогу партыйнаму кіраўніцтву ў справе выпраўленьня гэтых пасобных памылак. Таксама ня можа выступіць газэта супроць партыйнага кіраўніцтва і ва ўсякіх выпадках, дзе справа датычыць непрыцыпных пытаньняў.

Наадварот, у тых выпадках, калі друкаваны орган таго ці іншага партыйнага камітэту бачыць яўныя скажэньні партыйнай лініі, правы правага апартунізму на практыцы і, калі парткіраўніцтва ня ўжывае ніякіх крокаў да выпраўленьня праваапартуністычных памылак, спробы замазаць апартуністычныя памылкі, абмежаваецца прызнаньнем памылак на словах і працягваць іх на справе, газэта павінна выступіць на бязьлітаснае змаганьне за чыстату партыйнай лініі ў рабоце кіраўніцтва, за бальшавіцкую самакрытыку. Газэта ні ў якім разе не павінна быць бяспрынцыпным дадаткам групы апартуністаў. Газэта павінна быць баявым органам партарганізацыі, актыўным змагаром за генэральную лінію партыі.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваёй пастанове заклікае Барысаўскую арганізацыю згуртавацца вакол гэтай пастановы і мабілізаваць усе сілы на выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Няма ніякага сумненьня ў тым, што Барысаўская пралетарская партарганізацыя на чале з абноўленым кіраўніцтвам, вядучы бязьлітаснае змаганьне супроць правых і «левых» апартуністаў, разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б выканае тыя задачы, якія на яе ўскладзены. Барысаўская арганізацыя, мабілізуючы масы вакол задач завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР у трэцім годзе пяцігодкі, будзе адным з баявых атрадаў КП(б)Б у змаганьні за генэральную лінію партыі.

Аб становішчы ў барысаўскай партарганізацыі

Пастанова ЦК КП(б)Б ад 11 лютага 1931 году

Побач з дасягненьнямі барысаўскай партарганізацыі ў ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі ЦК адзначак рад буйнейшых прарываў у выкананьні прамфінпляну, перабудове партработы і рабоце масавых пралетарскіх арганізацый, асабліва каапэрацыі. Кіраўніцтва чартарганізацыі дапусьціла заціск самакрытыкі, які выявіўся ў забароне выданьня вызнной газэты «Кооперативная жизнь».

Кваліфікуючы гэтыя прарывы, як праяву правага апартунізму, ЦК прымае да ведама, што гэтыя прарывы і памылкі былі прызнаны на аб'яднаным пасяджэньні бюро РК і прэзыдыуму райКК у пастанове ад 28 студзеня 1931 году.

Адзначыць, што пленум РК у сваёй пастанове ад 28-30 студзеня ня выкрыў з усёй рашучасьцю гэтых прарываў і памылак, а наадварот, прыняты на пленуме першы пункт рэзалюцыі змазвае іх.

Партыйны друк і асабліва газэта «Зьвязда» ў асноўным правільна сыгналізавалі аб прарывах і памылках у рабоце барысаўскай партарганізацыі.

Адначасова ЦК лічыць палітычнай памылкай РК вынесеньне на абмеркаваньне партыйных калектываў пытаньня аб пазыцыі партыйных органаў друку, да абмеркаваньня гэтага пытаньня ў ЦК.

ЦК прапануе Барысаўскаму райкому правесьці шырокую растлумачальную кампанію ў партарганізацыі ў адпаведнасьці з данай пастановай. ЦК упэўнен, што барысаўская партарганізацыя на аснове бальшавіцкай самакрытыкі з усёй рашучасьцю ўскрые адзначаныя прарывы, мабілізуе і згуртуе свае рады для выкананьня задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, на аснове цьвёрдага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі ў змаганьні з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і прымірэньцтвам да ўхілаў ад лініі партыі.

Лічыць немагчымым цакінуць тав. Саслоўскага ў якасьці сакратара Барысаўскага райкому і адкліканць яго ў распараджэньне ЦК.

Ухваліць пастанову пленуму райкому аб выводзе са складу бюро райкому і зьняцьці з работы тав. Гарбатава і Далінскага. Пытаньне аб паводзінах тав. Гарбатага ў справе «Кооперативной жизни» перадаць на выразнаньне ў ЦКК.

Там, дзе няма самакрытыкі

У рэспубліканскай школе прафруху не разгорнута бальшавіцкая самакрытыка, як важнейшая зарука выкрыцьця нездаровых настрояў у пасобных членаў партыі і іх апартуністычнай практыкі.

Партыйная ячэйка займалася пытаньнямі самакрытыкі толькі фармальна, нібы «задбываючы пазіцыі», зафіксавала ў пратаколах сваіх пасяджэньняў для самастрахоўкі, што моў, мы займаліся самакрытыкай, змагаліся з яе душыцелямі.

Калі ў пасьленняй газэце зьявілася заметка, якая выкрывала антыпартыйныя ўчынкі члена партыі Каладзея, апошні прымаў усе захады, каб адшукаць аўтара заметкі—рабкора, «высьветліць яго сацыяльнае пахаджэньне і становішча» і прыцягнуць да адказнасьці за паклёп.

У часе абгаварэньня справаздачы старшыні рэдкалегіі на пасяджэньні бюро ячэйкі загадчык школай — тав. Бахцін патрабаваў ад старшыні рэдкалегіі тав. Бэйліна, каб той назваў прозьвішча рабкора, які напісаў заметку аб фактах антысэмітызму ў сьценах школы. Бахцін даказваў, што калі заметка напісана членам партыі, дык яна павінна была быць узгоднена(?!) з бюро ячэйкі і з загадчыкам школы да зьмяшчэньня ў насьценнай газэце.

Такіх фактаў можна падаць безьліч. Член партыі Гучкоў, на словах галасуючы за самакрытыку, згаджаючыся з дырэктывамі партыі ў гэтым пытаньні, на справе ня раз выступаў супроць рабкораў і рэдкалегіі насьценгазэты, якая зьмяшчае матар'ялы аб нетактычных паводзінах, аб антыпартыйных учынках асобных камуністаў. Кіраўніцтва ячэйкі на гэтыя факты не рэагавала.

У выніку таго, што бюро ячэйкі фактычна стала на шлях заціску самакрытыкі, на шлях дапамогі ў прасьледваньні актыўных рабкораў, у школе прафруху расквітнела нацоўка сярод асобных членаў партыі, хуліганства і г. д.

Толькі ў сувязі з тым, што ў школе няма шырока разгорнутай самакрытыкі, няма бальшавіцкай крытыкі недахопаў работы ячэйкі і асобных членаў партыі, у школе знайшоў сабе месца рад людзей, якія ў мінулым былі выключаны з партыі за растраты, п'янства, праваапартуністычную практыку і г. д., якія да гэтага часу заставацца нявыкрытымі.

Невядома, якім чынам у школу трапіў авантурнік, растратчык Смольскі. Смольскі ў свой час быў камсамольскай арганізацыяй мабілізаваны для работы ў каналыных Данбасу, але ён пасьпяшаўся пакінуць Данбас і вярнуцца ў БССР. Смольскі, імкнучыся захаваць сваё мінулае, падрабіў адзначэньня дакументы, якія сьведчылі аб яго «пралетарскім» пахаджэньні, аб «актыўнай» рабоце ў камсамоле і г. д. Працуючы ў школе прафруху, Смольскі за кароткі час адрэкамэндаваў сябе, як «актыўнага» работніка: прысвоіў 55 рублёў студзяцкіх грошай, падрабіў некалькі ніжэйшых МЦРК, растраціў плявыя ўзносы і г. д.

Калі рэдкалегія насьценнай газэты ўзьняла пытаньне аб выдзяленьні са школы Смольскага, як растратчыка, дэзэртыра і авантурніка, два члены бюро ячэйкі (Пугачоў і Гарбаш) упарта даводзілі, што са Смольскага можа быць добры і карысны работнік, што яго трэба перавыхаваць, а не выкідваць са школы. Такім чынам, кіруючыя работнікі ячэйкі стаялі на шляхі абароны чалавека, які ні ў якім разе ня можа быць у школе прафруху, які неадкладна павінен быць выключаны з камсамолу, як дэзэртыр, як здрадзік і кар'ерыст.

Студэнт Кападзэй ня так даўно быў выключан з партыі Петрыкаўскім райкомам КП(б)Б за растрату ў каапэрацыі, за праваапартуністычную практыку, за сувязь з кулацтвам і інш. Зараз Каладзей набывае веды ў школе прафруху для далейшай «дзейнасьці» і лічыцца членам партыйнай ячэйкі школы.

Сярод студэнтаў і ў радах ячэйкі ёсьць і такія людзі, як Нодэльман, Лабоцці і інш., якія ў свой час па нікальні раз прыцягваліся да партыйнай адказнасьці за праваапартуністычную практыку, за ўхіленьне ад выкананьня дырэктыў партыі, за адмаўленьне працаваць на рабфаку і г. д.

Партыйная ячэйка зусім не займалася пытаньнем, каго рыхтуе школа, наколькі такія людзі, як Смольскі, Нодэльман і інш., у далёкым будуць здольны ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі, будучы накіраванымі на прафесыянальную кіруючую работу.

Смольскія, Нодэльманы, Каладзеі да гэтага часу захаваліся ў школе толькі за-за адсутнасьці самакрытыкі, толькі таму, што кіраўніцтва партыйнай ячэйкі аказалася надта блізарукім, аказалася нездольным выканаць дырэктывы партыі аб разгортваньні самакрытыкі.

Д. і А.

МЫ СЫГНАЛІЗУЕМ

Расонскі раён па выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній як у мінулым, так і ў гэтым годзе займае адно з апошніх месц. Райком і райвыканком не забясьпечылі выкананьня дырэктыў аб індывідуальным ападаткаваньні кулацкіх гаспадарак, не аддалі патрэбнай увагі і не мабілізавалі парткіраўніцтва на выяўленьне гаспадарак, якія ўжываюць наёмную сілу, і гэтым самым спрылялі таму, што кулацтва, заставшыся нявыяўленым і індывідуальна не ападаткаваным, увесь час узмацняла работу, накіраваную супроць калектывізацыі.

У выкананьні плянаў збожжазагатоўчых і іншых кампаній раённыя арганізацыі выключна спадзяваліся на самацёк. Калі цэнтральныя дырэктыўныя органы выкрылі апартуністычную практыку раённых установаў, апошнія дапусьцілі рад перагібаў у бок абкладаньня і давядзеньня цьвёрдых заданьняў да серадняцкіх і нават бядняцкіх гаспадарак у той час, як да кулацкіх гаспадарак цьвёрдыя заданьні ня былі даведзены.

Амаль цалкам сарвалася сіласаваньне і будаўніцтва ў калгасах. У калгасным і прамысловым будаўніцтве было адкрытае шкодніцтва, пабудаваныя ільнапрацоўчыя пункты аказаліся ня-

Рабселькоры не адзін раз на гэтым пытаньні сыгналізавалі на старонках «Чырвонай Полаччыны» і іншых газэт, выкрываючы шкодніцтва, апартуністычную стаўку на самацёк, праваапартуністычную практыку асобных адказных работнікаў. Но матар'ялы, якія зьмяшчаліся ў газэтах, раённыя арганізацыі на чале з райкомам партыі не аварачалі ніякай увагі, вельмі часта выкрывалі аўтараў заметак—сельскораў і жорстка з імі расправуліся.

Па ініцыятыве сельскораў пры райкалгасасэкцыі была арганізавана насьценная газэта, у якой сельскоры-актывісты выкрылі рад фактаў заціску самакрытыкі, праваапартуністычнай практыкі ў рабоце раённых установаў. Замест таго, каб падтрымаць ініцыятыву сельскораў, каб ім дапамагчы арганізаваць шырокую грамадзкасьць на выкананьне дырэктыў партыі аб разгортваньні самакрытыкі, Расонская РСІ заняла справу аб прыцягненьні да адказнасьці рэдкалегіі насьценгазэты і сельскораў за тое, што яны адпавяліся зьмяшчаць у газэце матар'ялы, якія «трэба было (?) ўзгадняць з адпаведнымі органамі».

У раёне ёсьць 4 рабочыя «25-тысячнікі», якія прысланы спэцыяльна для работы ў калгасах. У калгасе працуе фактычна толькі адзін, іншыя перакідваліся некалькі раз з адной у другую ўстанову. «25-тысячнікі» і рабочыя-выдучэнцы знаходзяцца ў вельмі цяжкіх кватэрных умовах. Замест дапамогі выдучэнцы ігнаруюцца асобнымі адказнымі прадаўнікамі.

У раёне з вясны арганізуецца машына-трактарная станцыя, што накладае на партарганізацыі і раённыя ўстановы вялізарныя задачы ў справе арганізацыі калгаснага прыпыву і далейшага змаганьня за гаспадарчае замацаваньне існуючых калгасаў, за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы. Ня гледзячы на гэта, падрыхтоўка да арганізацыі МТС фактычна яшчэ не распачата. Трактары, якія хутка прыбудуць у раён, будуць стаяць пад адкрытым небам, бо ніякіх памяшканьняў для трактараў і сельска-гаспадарчых машын не пабудавана і падрыхтоўка да будаўніцтва апошніх не распачата.

Перанымаючая кампанія праўдзівага калгасаў праводзіцца выключна прадаўнікамі райкалгасасэкцыі без усякай дапамогі з боку райкому партыі, партыйных ячэек, саветаў і прафарганізацый. **Гэта важнейшая кампанія ў рабоце не скарыстана для мабілізацыі шырокіх мас калгаснікаў на правядзеньне падрыхтоўкі да чесняваой пасаўнай кампаніі, не скарыстана для арганізацыі далейшага калгаснага прыпыву.**

Па сутнасьці падрыхтоўка да веснавой сяўбы ня вынесена а габінэтаў раённых установ.

Вялізарныя прарывы ў рабоце раённых арганізацый, у правядзеньні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній тлумачацца ў першую чаргу тым, што маса камуністаў не мабілізавана на выкананьне чарговых задач, што замест дапамогі сельскім саветам і ніжэйшым партыйным ячэйкам раённыя ўстановы праз сваіх упаўнаважаных вельмі часта падмяняюць сельсаветы і гэтым глушаць іх ініцыятыву, актывізацыю і самастойнасьць у выраўнаньні адпаведных задач, якія стаяць перад сельсаветамі.

У раёне панае заціск самакрытыкі, мае месца цякучасьць складу прадаўнікоў раённых установ—усё гэта адбіваецца на рабоце партарганізацыі па выкананьні важнейшых дырэктыў партыі і ўраду.

Фактычна работай райвыканкому і райкому партыі «кіруе» Куксаў, адзін з найбольш старых прадаўнікоў Расонскага раёну. Куксаў у часе белапольскай акупацыі дапамагаў белапалякам распраўляцца з чырвонымі, на сацыяльным пахаджэньні зьяўляецца сынам буйнога памешчыка, але гэта ніколі яму не перашкаджае знаходзіцца на кіраўнічай рабоце ў раёне, жорстка расправуліцца з тымі, хто адважваецца супроць яго выступаць, крытыкаваць яго праваапартуністычную дзейнасьць, якая накіравана на ўсяду клясавану ворагу—кулаку. Куксаў праводзіць сваю «дзейнасьць» пры поўным падтрыманьні старшыні райКК-РСІ тав. Крупіцы, які добра ведае тое, што Куксаў працаваў у белапаляках, што ён у практычнай рабоце ажыцьцяўляе лёзунг аб ураўнаваньні кулака з сацыялізмам.

Мы лічым, што адпаведныя органы павінны заняцца пытаньнем, наколькі здольна Расонскае раённае кіраўніцтва пры такім становішчы змагацца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Рабочыя-выдучэнцы і «25-тысячнікі»: Самуйлаў, Тагуноў, Багданаў, Галубок, Данюшкін, Мажэйка, Тучанка і Палашанка.

Ніякай літасьці

ДА ГЛУШЫЦЕЛЯЎ САМАКРЫТЫКІ

За апошні час «Зьвязда» зьмясьціла на сваіх старонках некалькі допісаў з Чарэйскага раёну, якія сыгналізавалі аб палітычных прарывах у рабоце рабфака парткіраўніцтва. У апошнім артыкуле (№ 15 ад 16-І) паказвалася на адсутнасьць у Чарэйскай арганізацыі самакрытыкі, разгортваньня якой не забясьпечыла раённае парткіраўніцтва. У гэтым артыкуле былі названы факты грубага заціску самакрытыкі сакратаром РК Фахэнгаўзам.

Замест прызнаньня па-бальшавіцку памылак, замест неадкладнай мабілізацыі партыйных мас на зьнішчэньне недахопаў у рабоце, на выпраўленьне палітычных памылак, замест прыняцьця захадаў да разгортваньня самакрытыкі, як важнейшага сродку ў барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, сакратар РК Фахэнгаўз «рэагуе» на артыкул па-свойму, становіцца на ніжні, ня варты годнасьці камуніста шлях.

Са зьяўленьнем артыкулу ў «Зьвязьдзе» аб палітычных правалах у кіраўніцтве Чарэйскай арганізацыі, Фахэнгаўз заяўляе байкотам: ён у адзнаку пратесту супроць крытыкі ў друку не зьяўляецца на працягу двух дзён на работу. Мала таго, Фахэнгаўз пачынае распаўсюджваць паклёпніцкія абывательскія плёткі на аўтара артыкулу. Гэты артыкул Фахэнгаўз ахарактарызаваў, як «стопроцентны паклёп на раённае парткіраўніцтва» і, нарэшце, дадаў: «нто-ж, гэтага і можна было чакаць, калі зараз усякі мае права пісаць у нарыйна-савецкі друк».

Камісія ЦК КП(б)Б, абсьледаваўшы ў гэтым раёне работу партарганізацыі, побач з выяўленьнем фактаў невыпраўленьня да гэтага часу дапушчаных вясной мінулага году «левых» перагібаў, парушэньня ўнутры партыйнай дэмакратыі, адміністраваньня замест кіраўніцтва, пратэкцыянізму з боку Фахэнгаўза, устанавіла наяўнасьць заціску самакрытыкі і рад іншых адмоўных зьяўлеінч, аб якіх пісалася ў друку. Між тым на сходзе раённай партарганізацыі, скліканым для абмеркаваньня становішча работы, Фахэнгаўз не палічыў патрэбным і словам упамянуць аб буйнейшых палітычных памылках у рабоце, а ўсё сваё выступленьне зьвёў да шапуляваньня сваіх «заслуг», да нападу на тых таварышоў, якія пабальшавіцку выкрывалі недахопы і памылкі ў рабоце раду парт'ячэек і раённага парткіраўніцтва.

— Хто работу райкому крытыкуе?—пытаецца Фахэнгаўз і тут-жа адказвае: «Таганові́ч і іншыя, якія нядаўна пралезьлі ў партыю». У такім тоне Фахэнгаўз «перабраў» палову ўдзельнікаў сходу, абліў гразьзю, прышыў ярлыкі апартуністаў, трацкістаў, контр-рэвалюцыянераў, кнасьцістаў, ахаяў, што толькі трапляла на язык, усіх тых партыйцаў, якія таварылі на сходзе аб недахопах у рабоце рабфака парткіраўніцтва.

Сваім выступленьнем на сходзе райпартарганізацыі Фахэнгаўз ашчэ раз праявіў сябе, як мацёры, неизпраўны слушыцель пралетарскай самакрытыкі. Фахэнгаўз «адмаглосна» прагаласаваў супроць пастановы нарсходу, у якой гаварылася што артыкул «Зьвязды» аб палітычных правалах у рабоце раённага парткіраўніцтва» ў аснаўным адпавядае сапраўднасьці.

Між іншым Фахэнгаўз на ранейшай рабоце ў Вузьдзенскай раённай партарганізацыі вядомы, як зажымшчык самакрытыкі і парушэньнік унутрыпартыйнай дэмакратыі, аб чым у свой час пісалася ў друку. На рабоце ў Чарэі ён не правіў прымет здольнасьці ажыць свае памылкі і бяспрынцыпную упартасьць разгортваньню самакрытыкі. Ёсьць-жа такія людзі, якіх колькі ня б за іх памылкі, яны ашчэ больш становяцца ўпартымі, больш тупеюць.

Фахэнгаўзаўская ўпартасьць зломлена Чарэйскай партарганізацыяй, якая здолее зараз узьняць бальшавіцкую самакрытыку на вышыню палітычных задач, рашуча б'ючы на глушыцеляў самакрытыкі.

Ів.

На ўсебеларускай нарадзе работнікаў сувязі

ПРАМОВА тав. БЭНЭКА

Таварышы, дазвольце ад імя ЦК КП(б)Б і ад імя Савету Народных Камісараў выказаць вам шчырае таварыскае прывітаньне (воплескі).

Таварышы, вы сабраліся ў той час, калі ўся наша краіна, увесь Савецкі Саюз, у тым ліку і БССР, уступілі ў 3-ці рашаючы год пяцігодкі.

За апошнія два гады пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы з вялікімі посьпехамі выканалі намячэньні пяцігадовага пляну амаль што па ўсіх галінах нашай прамысловасьці, а па многіх галінах народнай гаспадаркі намячэньні пяцігадовага пляну значна перавыканалі. Мы маем вялізарнейшыя посьпехі перавыкананьня намячэньняў пяцігодкі, бо ў гэтай справе прымаюць удзел мільёны, бо ў будаўніцтва пяцігодкі ўцягнуты мільёны рабочых, уцягнуты праз калектывізацыю дзесяткі мільёнаў батракоў, беднякоў і сераднякоў.

Вось чаму мы, таварышы, маем такія вялізарнейшыя посьпехі, вось чаму мы можам намецiць новыя вялікія заданьні на 3-ці рашаючы год пяцігодкі.

Ці зможам мы выканаць тыя намячэньні, якія вызначаны на 3-ці год пяцігодкі? Вязумоўна, зможам, ня гледзячы на тое, што гэтыя намячэньні больш напружаныя, чым у першыя два гады пяцігодкі, ня гледзячы на тое, што мы ў 3-ці год павінны выканаць у асноўным пяцігодку па радзе рашаючых галін прамысловасьці. Аб гэтым сказаў тав. Сталін і гэта кожны з нас, хто пізнаёцца нашым эканамічным жыцьцём, хто назірае за тым, як выконваецца пяцігодка, можа пацьвердзіць, што ў нас, у БССР, па радзе галін прамысловасьці пяцігодка будзе выканана за 3-3½ гады.

Такім чынам, мы дабіліся такіх тэмпаў, якіх ніколі ня было ў гісторыі, і калі першыя гады нашай працы па ажыцьцяўленьні пяцігодкі буржуазны друк і буржуазныя наогул сустрэлі з усьмешкай і іроніяй, дык зараз ужо аусім іншае. Мы зараз бачым, як буржуазія пачынае выступаць супроць пяцігодкі, супроць рабочай клясы, супроць Савецкага Саюзу. Чаму? Буржуазія добра ведае, што калі мы з посьпехам выканаем пяцігодку (а мы, таварышы, у гэтым упэўнены), то гэта значыць, што Савецкі Саюз стане ашчэ больш магутным фактарам міжнароднай эканомікі і палітыкі і тады Савецкі Саюз стане настолькі магутным, што з ім трэба будзе таварыць больш далікатна, чым зараз некаторыя буржуазныя краіны гаворыць. Савецкі Саюз стане сталёвым саюзам, сталёвай дзяржавай.

Мы ставім перад сабой задачу выраблць да канца пяцігодкі больш 17 млн. тон мэталю, мы ў гэтым годзе ўжо дасягаем вырабу мэталю ў такой колькасьці, як у Англіі. Гэта ёсьць ажыцьцяўленьне на справе лёзунгу «дагнаць і перагнаць».

Таварыш Сталін, выступаючы на канферэнцыі гаспадарнікаў, сказаў, што мы адсталі прыблізна на 50-100 год ад буржуазных дзяржаў і мы павінны гэтыя 50-100 год прабегчы на працягу 10 год ні больш. Чаму? Таму, што калі мы будзем далей адставаць, а як тав. Сталін гаворыць, адставчых б'юць, то для таго, каб нас ня білі, трэба дагнаць, трэба стаць магутнай краінай, з якою будуць гаварыць, як з роўнай і магутнай.

Пасьпяховае выкананьне заданьняў першых гадоў пяцігодкі ўжо ўзварушыла буржуазію, якая ня можа спакойна сядзець і рыхтуецца да таго, каб сапраўць далейшае будаўніцтва нашай гаспадаркі, спыніць ажыцьцяўленьне нашай пяцігодкі.

Гаварыць аб тым, што мы супроць імпэрыялістычнай вайны, што нам вайна непатрэбна, што ў нас даволі працы, што ў нас даволі заняткаў, — ня чаго. Кожны працоўны, кожны селянін, кожны рабочы ведае добра аб тым, што палітыка нашай камуністычнай партыі і нашага ўраду зьяўляецца мірнай палітыкай. Гэта мы даказалі дзесяткі і сотні раз. Цалы рад праваказцый, якія былі накіраваны супроць Савецкага Саюзу, не маглі выклікаць вайны. У нашага ўраду, у камуністычнай партыі нэрвы даволі моцныя і яшчэ не ўдалося нас уцягнуць у вайну. Але спробы ашчэ ня кінуты, спробы працягваюцца і надалей: і «крестовый поход», і дэмпінгавая кампанія, і арганізацыя так званай «пан-Эўропы» — гэта арганізацыі эўрапэйскіх дзяржаў супроць Савецкага Саюзу і г. д. — усё гэта сьведчыць аб тым, што буржуазія ніяк ня можа спакойна глядзець на разьвіцьцё Савецкага Саюзу.

Побач з гэтымі посьпехамі мы маем значныя посьпехі таксама і ў галіне сувязі. Зразумела рэч, для таго, каб ажыцьцявіць праграму, для таго, каб добра кіраваць такой вялікай краінай, якою зьяўляецца наш Савецкі Саюз, і ны тым, калі ўсё ўмовы і эканамічныя і палітычныя ў нашай краіне зьмяніліся, і калі мы павінны кіраваць нашай гаспадаркай а алнаго цэнтру, калі зараз у нас усё больш і больш цэнтралізуецца гаспадарка па асобных галінах,—сувязь адыгрывае вялікую ролю.

Памыляюцца тыя таварышы, якія гаворыць, што транспарт зьяўляецца нэрвам краіны; гэта няправільна, нэрвам краіны зьяўляецца сувязь. І вось, калі гэтыя нэрвы, па якіх трэба перадаваць усякага роду распараджэньні, дырэктывы і ўказаньні, дрэнна працуюць, калі гэтыя нэрвы атрафіраваны, тады, зразумела рэч, увесь арганізм будзе працаваць дрэнна.

І вось чаму сувязь зараз набывае асаблівае значэньне. Зусім-жа зразумела, што немагчыма, каб кожны калгас, саўгас, якія зараз арганізуюцца на вёсцы, заставаліся бяз сувязі. Мы павінны зрабіць усё, што ад нас залежыць, для таго, каб лепш зьвязаць з гарадам нашы калгасы, саўгасы, раёны і сельсаветы.

Гэта патрэбна таму, што без падтрыманьня вёскі да гораду нам будзе вельмі цяжка зьнішчаць тую розьніцу, якая існуе паміж горадам і вёскай. Буржуазныя тэарэтыкі пісалі (і да гэтага часу ашчэ пішуць), што немагчыма зрабіць роўнасьць паміж горадам і вёскай. «Вёска — кажуць яны — па сваіх прыродных і інш. эканамічных умовах заўсёды застанецца азаду гораду, ніколі вёска ня будзе роўнай з горадам» і г. д.

Гэту буржуазную тэорыю мы—камуністы — тэарэтычна разьбілі і зараз разьбіваем практычна; калі нам удасца на працягу бліжэйшых гадоў ажыцьцявіць усё тое, што мы намецілі,

Пакончыць з апартуністычным благадушшам і бязьдзейнасьцю

У бальшавіцкі бой за кожнае кілё ільну

Жлобінскі і Парыцкі райкомы КП(б)Б не забясьпечылі бальшавіцкага кіраўніцтва двухдзяднікам штурму ільназагатовак

Адкрываем завочны мітынг-пераклічку

СЕНЬНЯ РОБЯЦЬ СПРАВАЗДАЧЫ: ДРЫСА, ВІЦЕБСК, СУРАЖ І ВЕТРЫНА

ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ МІТЫНГУ-ПЕРАКЛІЧКІ АДБУДЗЕЦЦА 18 ЛЮТАГА. СПРАВАЗДАЧЫ РОБЯЦЬ: САКРАТАРЫ АРШАНСКАГА, БАБРУЙСКАГА, ЛУПАЛАЎСКАГА РК КП(б)Б І СТАРШЫНІ ЖЛОБІНСКАГА І ГЛУСКАГА РАЙВЫКАНКОМАЎ

Слова даецца старшыні ЦКК і нам, старшыні СНК т. Калніну

Таварышы, ільназагатоўкі адбываюцца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Кулак сабатаваў сяўбу ільну. Кулак напружвае ўсе свае сілы, каб сарваць пляны ільназагатовак. Кулак у саюзе са шкоднікам, бюракратам і апартуністам з загатоўчых і рэгулюючых арганізацый імкнецца шляхам зрыву ільназагатовак сарваць бальшавіцкія пляны сяўбы і кантрактацыі ільну на 1931 год, сарваць калектывізацыю. Клясавы вораг імкнецца шляхам зрыву ільназагатовак затармазіць тэкстыльную прамысловасьць Іванава-Вазьнясенску, Арэхава-Зуева і іншых пралетарскіх тэкстыльных цэнтраў. Задача нашых партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый, бядняцка-серадняцкіх і калгасных мас на вёсцы—сарваць пляны клясавага ворага, даць поўнаючы адпор кулацтву і 100 проц. кананьнем плянаў ільназагатовак дабіцца яшчэ аднэй перамогі ў барацьбе з кулаком, у барацьбе за пяцігодку за чатыры гады.

На жаль, ня ўсе партыйныя арганізацыі ўявілі сабе клясавы характар і палітычнае значэньне барацьбы за лён. Рад раённых арганізацый ігнаруюць дырэктывы Цэнтральнага Камітэту і СНК аб давядзеньні цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак. Віцебск, Сіроціна, Жлобін, Ветрына, Прапойск, Лупалава—здаюць пазыцыі клясаваму ворагу на фронце ільназагатовак. Даючы мізэрныя цьвёрдыя заданьні кулаку,

Напярэдадні трэцяга ўсебеларускага настаўніцкага зьезду

НАСТАЎНІК—
АКТЫЎНЫ ЗМАГАР НА ФРОНЦЕ БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ

15 лютага зьбіраецца 3-ці настаўніцкі ўсебеларускі зьезд. Зьезд склікаецца ў момант, калі краіна ўступіла ў трэці рашаючы год пяцігодкі, калі пралетарыят СССР і ўсяго Савецкага Саюзу ў саюзе з асноўнымі масамі сялянства, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, з няўпынным энэргічным змаганьнем за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Гэта змаганьне праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, ва ўмовах, калі капіталістычныя элементы шалёна супраціўляюцца пераможнаму наступленьню сацыялізму, ня спыняюцца ні перад якімі мерамі, каб перашкодзіць пралетарыяту выканаць гістарычныя задачы, намечаныя XVI зьездам і сьнежаньскім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б).

За пэрыяд паміж 2-ім і 3-цім настаўніцкімі зьездамі адбыліся вялізарныя сацыяльна-эканамічныя зрухі ў краіне. Гэтыя зрухі глыбока закранулі і настаўніцтва, якое зьяўляецца адным з важных атрадаў культурнай рэвалюцыі.

Шпарка праходзіць працэс паляпшэньня сацыяльнага складу настаўніцтва; узрастае партыйна-камсамольская прашлойка, прашлойка выхадцаў з пралетарскіх батрацка-бядняцкіх сем'яў і ўвесь час зьніжаецца прашлойка выхадцаў з чужога і варожага пралетарыяту асяродзьдзя. За гэты час у рады настаўніцтва вліліся сотні і тысячы людзей, якія пэдагагічную асьвету атрымалі ў савецкай школе.

Асноўная маса настаўніцтва цьвёрда ідзе на шляху актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве і разам з пралетарыятам, з шырокімі коламі працоўнага сялянства, пад кіраўніцтвам ВКП(б), змагаецца за пасьпяховае вырашэньне праблемы культурнай рэвалюцыі, дапамагае пралетарыяту хутчэй і спачаткова дабіць спадчыну царскага ўраду—няпісьменнасьць.

Асноўная маса настаўніцтва актыўна адгукаецца на заклікі партыі, на яе лёзунгі, на задачы, якія пастаўлены зьездамі партыі. Будучы ў першых радох барацьбітоў за культурную рэвалюцыю, асноўныя масы настаўніцтва затартоўваюцца ў клясавых баёх за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

У той час, як асноўная маса настаўніцтва змагаецца пад лёзунгамі камуністычнай партыі, зьяўляецца актыўным барацьбітом на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, невялічкая частка варожа-настроенага да сацыялістычнага будаўніцтва настаўніцтва адкрыта або ў замаскаванай форме блёкуецца з кулаком, дзейнічае з ім заадно супроць мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Гэта вызначная частка выхадцаў з клясава-варожага асяродзьдзя імкнецца праводзіць і ў пытаньнях нацыянальна-культурнага будаўніцтва лінію клясавых ворагаў—на зрыў сацыялістычнага наступленьня, на рэстаўрацыю капіталізму.

Дыфэрэнцыяцыя настаўніцтва, якая адбываецца на фоне клясавага змаганьня, прымушае нас увесь час працягваць работу на ачыстцы настаўніцкіх радоў ад клясава-варожых элемэнтаў, ад людзей, якія сваю дзейнасьць накіроўваюць ва ўгоду клясаваму ворагу—кулаку.

У БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, за апошнія гады значна палепшылася матар'яльнае становішча настаўнікаў. Мы павінны паставіць настаўніка на такую вышыню, на якой ён не стаяў, ні будзе стаяць ні ў адной капіталістычнай краіне» (Ленін). Мы гэту задачу выконваем у сваёй штодзённай рабоце, яна знаходзіць сваё практычнае вырашэньне ў шматлікіх настановах партыі і ўраду.

У СССР настаўніцтва займае адно з ганаровых месц у вырашэньні праблемы культурнай рэвалюцыі, у агульным змаганьні пралетарыяту за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. Таму задача далейшага паляпшэньня матар'яльных умоў настаўніцтва зьяўляецца бадзёрай задачай усёй грамадзкасьці.

Вялікадзяржаўныя шавіністы, нацдэмы, шавіністы іншых колераў, змагаючыся супроць ленінскай нацыянальнай, імкнуліся нашкодзіць сваёй уплыў на шырокія колы настаўніцтва, зрабіць настаўніцтва зброяй у сваіх руках для змаганьня з дыктатурай пралетарыяту, за рэстаўрацыю капіталізму на Беларусі. Нацыянал-дэмакраты і нацыянал-апартуністы імкнуліся культурнае будаўніцтва ў нашай краіне паставіць сабе на службу, зрабіць культуру буржуазнай на зьмесьце.

Асноўная маса настаўніцтва дала руйнуючы адпор контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратам, разам з партыяй выкрыла тэорыі нацдэмаў, растлумачыла шырокім масам працоўных сапраўдныя намеры беларускіх нацдэмаў.

Але сярод настаўніцтва знайшлася і такая частка—зусім нязначная, якая пайшла на повадзе ў нацыянал-дэмакратаў, падхапіла і прапагандавала іх буржуазныя тэорыі.

Рабочая кляса, працоўная інтэлігенцыя, шырокія масы працоўнага сялянства, пад кіраўніцтвам партыі, выкрылі твар вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, твар контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму, выкрылі і разьбілі буржуазныя тэорыі, якія былі накіраваны на змаганьне з дыктатурай пралетарыяту, за рэстаўрацыю капіталізму.

Зьезд павінен абгаварыць рад важнейшых пытаньняў работы сярод настаўніцтва як у горадзе, так і на вёсцы. Мобілізаваць шырокія масы на выкрыцьцё і жорсткую барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад ленінскай нацыянальнай палітыкі, на барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі ўсіх колераў, за выразнае і пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі.

Настаўнік павінен быць ударным работнікам ня толькі ў школе, але і ўдарнікам на іншых франтох культурнай рэвалюцыі, ударнікам па дапамозе партыі выконваць гістарычныя задачы будаўніцтва сацыялізму.

Настаўніцкі зьезд сваімі настановамі яшчэ больш паблізіць школу да вытворчасьці, да сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, забясьпечыць рашучую перабудову яе па шляху палітэхнізму, прыме такія настановы, якія-б поўнасьцю забясьпечылі пабудову навучальных планаў, выходзячы з задач камуністычнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня, з задач сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце.

Пад знакам баявой падрыхтоўкі да зьезду

Гэтымі днямі адбылася раённая канфэрэнцыя асьветнікаў Сіроцінчыны. Канфэрэнцыя праходзіла пад знакам баявой падрыхтоўкі асьветнікаў раёну да трэцяга ўсебеларускага настаўніцкага зьезду, да правядзеньня штурму па ліквідацыі прарываў на фронце ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці, да правядзеньня бальшавіцкай сяўбы.

На канфэрэнцыі з усёй выразнасьцю высьветлілася, што прарываў, асабліва на культурным фронце, у Сіроцінскім раёне шмат. Усеагульным навучаньнем ахоплены дзеці школьнага ўзросту (8-10 год) на 97 проц., але калі прыняць пад увагу адсеў, які ёсьць, дык процант ахопу будзе значна ніжэйшы. Пераросткі (11-15 год) ахоплены процантаў на 60, але і гэта лічба далёка недакладная.

Гарачых сьпеданьняў ва ўсіх школах раёну няма, ня гледзячы на тое, што большасьць школ мае на гэта сродкі.

Такое становішча трэба тлумачыць выключна бязьдзейнасьцю сельсаветаў, загадчыкаў школ, пры бязмоўна значнай віне райінспектуры.

Да гэтага часу сельсаветы (у пераважнай сваёй большасьці) не павярнуліся тварам да культурнага будаўніцтва і глядзяць на гэту галіну работы, як на другарадную. Сельсаветы амаль ня цікавяцца становішчам колькаснага ахопу дзяцей усеагульным навучаньнем, а некаторыя з іх нават ня маюць вестак аб колькасьці няпісьменных і ахопе іх вучобай.

З дакладу старшыні райвыканкому высьветлілася, што ня лепшая справа і з падрыхтоўкай да весьнавой сяўбы. Раённая МТС надзвычай марудна разгортвае работу па заключэньні калдагаворуў з калгасамі, а райкалгассаюз аб гэтым не клапоціцца. У раёне ня выкананы поўнасьцю заданьні на загатоўках ільну, лесу і інш.

Па выкліку 20 камсамольцаў - настаўнікаў гэтага раёну ўдзельнікі канфэрэнцыі цалкам замацаваліся на рабоце ў раёне да канца пяцігодкі, абвясьцілі сябе ўдарнай брыгадай па ліквідацыі вышэйадзначаных прарываў. Тутжа на канфэрэнцыі былі заключаны сацдагаворы з вызначэньнем канкрэтных аб'ектаў ударніцтва.

На трэці ўсебеларускі настаўніцкі зьезд выбраны 2 лепшыя ударнікі, настаўнікі раёну — т. т. Казлоўскі і Аксёнава.

Асьветнікі парашылі прыйсьці на зьезд з найбольшымі дасягненьнямі раёну на гаспадарчым і культурным фронце.

Кіраўніцтва, асабліва райвыканкам саюзу працасьветы, абавязаны энэргічна узьняты энтузіязм асьветнікаў накіраваць на шляху бальшавіцкай работы ў справе ліквідацыі прарываў.

М. ЛЕВІН.

Пра склад і работу зьезду

На 3-ці ўсебеларускі настаўніцкі зьезд чакаюцца **305** дэлегатаў. З гэтага ліку **255** радавых настаўнікаў - ударнікаў і **50** рабочых ад варштату, сельска-гаспадарчых рабочых і калгаснікаў.

На зьезд запрошана 7 старшынь буйнейшых раённых праўленьняў саюзу працасьветы. Апрача таго **запрошаны госьці—асьветнікі з Украіны, Паўночнага Каўказу, Татарскай рэспублікі, з Уралу і Маскоўскай вобласьці.** З Украіны прыяжджае 7 чал.: два прадстаўнікі Татарыі прыбылі ўжо ўчора.

Зьезд заслухае і абгаворыць рад важнейшых пытаньняў практычнага ўдзелу настаўніцтва ў сацыялістычным будаўніцтве. **У парадку дня зьезду—даклады: «Рэканструкцыйны пэрыяд і задачы настаўніцтва» (дакладчык т. Гей), «Вынікі і пэрспэктывы культурнага будаўніцтва ў БССР» (дакл. т. Платун), «Удзел камсамолу ў культурным будаўніцтве» (т. Рубенчык) і «Чарговыя задачы прафсаюзу па рабоце сярод настаўніцтва» (т. Рычкоў).**

Урачыстае адкрыцьцё зьезду адбудзецца заўтра, у 7 гадзін вечара, у памяшканьні Белдзяржтэатру. Дзелавая работа яго будзе праходзіць у Доме Камасьветы.

ЦП саюзу працасьветы рыхтуе да зьезду выстаўку, якая адлюструе становішча палітэхнізацыі, усеагульнага навучаньня і ліквідацыі нялісьменнасьці ў БССР. У Доме Працасьветы наладжваецца выстаўка школьных і сазюзных насьценгазэт. У Доме Камасьветы—выстаўка пэдагагічнай і бягучай літаратуры.

16-га лютага дэлегаты калектыўна наведаюць гукавое кіно «Чырвоная зорка». 17-га, па ініцыятыве гаркому ЛКСМБ, адбудзецца вечар сустрэчы дэлегатаў зьезду з камсамольцамі-ударнікамі менскіх прадпрыемстваў.

У часе работы зьезду будуць **арганізаваны экскурсіі дэлегатаў на буйнейшыя прадпрыемствы Менску і ў музэй Рэвалюцыі.** Госьці-ж, апрача таго, наведаюць рад культурных устаноў і магчыма зьезьдзяць на Асінстан.

Зьезд заслухае рапарты лепшых школ і прадпрыемстваў Менску, Гомелю, Віцебску і Барысава.

Юр.

Аднаразовы збор—узмацненьне фінансавай базы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва

Усе сілы—на рэалізацыю пастановы ўраду

УСІМ ОРГАНАМ НАРОДНАЙ АСЬВЕТЫ, УСІМ АСЬВЕТНІКАМ, УСЁЙ КУЛЬТАРМІІ

Урад БССР, улічваючы вялізарныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва, якія пастаўлены ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, ва ўмовах разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, вынес рашэньне на падставе пастановы Саюзнага ўраду правесьці на ўсёй БССР аднаразовы збор на культурнае і гаспадарчае будаўніцтва ў гарадох і сельскіх мясцовасьцях.

Кампанія па зборы на культурна-гаспадарчае будаўніцтва абмежавана кароткімі тэрмінамі. Да 1-га сакавіка збор павінен быць скончан на вёсцы, з лютага пачаўся збор з рабочых і служачых у гарадох.

Усе сабраныя сумы па аднаразовым зборы пойдуць у мясцовыя, гарадзкія, раённыя і сельскія бюджэты на паскарэньне культурнага і гаспадарчага ўздыму гораду і вёскі.

У мэтах забясьпячэньня своячасовага і правільнага правядзеньня аднаразовага збору Народны Камісарыят Асьветы прапануе:

1. Усім масавым культустановам (школам, хатам-чытальням, клюбам, бібліятэкам, школам пісьменнасьці і інш.) разгарнуць масавую работу сярод працоўных гораду і вёскі па растлумачэньні пастановы ўраду аб значэньні аднаразовага збору, аб тэрмінах і парадку яго правядзеньня.

2. Па ўсіх школах правесьці сходы вучняў сумесна з бацькамі па пытаньні аднаразовага збору, вылучаючы са складу вучняў і культармейцаў ударныя брыгады для правядзеньня масавай растлумачальнай работы сярод насельніцтва.

3. Арганізаваць праз радыё-станцыі рад інструкцыйных гутарак для культармейцаў.

4. Арганізаваць тэрміновы выпуск аднадзенных друкаваных газэт, лістовак, насьценгазэт, лёзунгаў для кіно, клюбаў, хат-чытальнь і чырвоных куткоў.

5. Раённым і гарадзкім інспэкцыям асьветы ўстанавіць рэгулярную сувязь з месцамі і атрыманьне аператыўных зводак аб ходзе аднаразовага збору.

Ніводная культурна-асьветная ўстанова не павінна застацца ў баку ад справы правядзеньня аднаразовага збору! Уся асьветная армія павінна безадкладна арганізавацца для разгортваньня масавай растлумачальнай работы на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва!

Народны камісар асьветы БССР
ПЛАТУН.

Апартуністы з вузьдзенскай фінчасткі зрываюць спагнаньне аднаразовага збору

Усе ўстаноўленыя тэрміны для падрыхтоўчай работы па аднаразовым зборы на гаспадарча-культурнае будаўніцтва даўно прайшлі. Але Вузьдзенскі раён ня толькі не прыступіў да спагнаньня аднаразовага збору, але на 5 лютага ня скончыў яшчэ налічэньняў і не даручыў паведамленьняў платнікам.

Зусім натуральна, што ў выніку такой бязьдзейнасьці Вузьдзенскі раён апынуўся ў хвосьце выкананьня дырэктыў аб аднаразовым зборы.

Трэба моцна ўдарыць па апартуністах, якія тармозяць выкананьне важнейшых пастаноў ураду.

Язьмін.

Паступіла толькі 60 проц.

БАБРУЙСК. (Па тэлефону, наш кар.). Налічэньні аднаразовага збору па прыватным сэктары г. Бабруйску скончаны. У першы тэрмін павінна паступіць 44.560 руб. Паступіла толькі 25.700 руб.

Работа па вылічэньні асоб, якія жывуць на невядомыя прыбыткі, ідзе слаба.

Райком камсамолу вылучыў у дапамогу брыгадам 85 чал., але на скліканую нараду зьявілася ўсяго 8 чал.

У часе правядзеньня праверачнай работы ў горадзе вылулена 50 беспатэнтных асоб.

А. МАГІДАЎ.

МЕНСК

Новыя кватэры—рабочым

Прэзыдыум гарсавету зацьвердзіў плян жыльлёвага будаўніцтва на бягучы год на лініі гарсавету.

На будаўніцтва жыльлёвых дамоў—камянюц вызначана 1 млн. 270 тыс. руб., з іх 500 тыс. руб. на скончаньне пачатага жыльлёвага будаўніцтва і 770 тысяч руб. на будаўніцтва новых дамоў. У новае будаўніцтва ўключана пабудова 90 кватэрнага дому, і 2-х дамоў для рабочых Эльводу і цагелень.

«На будаўніцтва дрыўляных дамоў адпушчана 494 тыс. руб. Будзе пабудавана 150 кватэр для рабочых заводаў «Энэргія», «Камунар», «Бальшавік», фабрыкі «Кастрычнік», цагелень і рабочых хапчоўай прамысловасьці.

На дачнае будаўніцтва вызначана 50 тысяч руб. Будзе пабудавана 42 дачныя пакоі. На рамонт камунальных дамоў выдаткуецца 182 тыс. руб.

Прэзыдыум зьвярнуўся ў СНК БССР з просьбай абавязаць упаўнаважанага Наркамшляхоў зносіць пры ўрадзе БССР адпусьціць сродкі на жыльлёвае будаўніцтва ў Менску для чыгуначнікаў.

Напярэдадні Усебеларускага зьезду саветаў

Гарсавет даручыў аддзелу дабрабыту ў тонар Усебеларускага зьезду саветаў набудаваць у горадзе арку і ўпрыгожыць вуліцы лёзунгамі і плякатамі.

МЦРК даручана абслугоўваць дэлегатаў харчаваньнем. Дэлегатам будзе аказана мэдычная дапамога. Устаноўлен дармовы праезд дэлегатаў на трамваі з правам уваходу праз пярэднюю пляцоўку.

Хто можа быць прымацаваным да закрытых разьмеркавальнікаў?

Прэзыдыум ЦСПСБ устанавіў, хто мае права быць прымацаваным да закрытых разьмеркавальнікаў.

Да закрытых разьмеркавальнікаў маюць права быць прымацаванымі рабочыя, інжынэрна-тэхнічны пэрсанал, служачыя і іх утрымаванцы данага прадпрыемства, вылучэнцы. Апрача таго, утрымаванцы 25-тысячнікаў і мабілізаваных на вёску, хатнія работніцы прымацаваных, работнікі стаповак, буфэтаў, рамонтных майстэрань, мэдпунктаў, закрытых разьмеркавальнікаў і міліцыянэры данага прадпрыемства.

Закрыўся Усебеларускі зьезд Асоавіяхіму

12 лютага на вячэрнім пасяджэньні зьезд зацьвердзіў рэзалюцыі па ўсіх дакладах. Цэнтральны савет абраны ў складзе **69** асоб, з іх **15** жанчын. Рэвізійная камісія абрана з 13 членаў і 4 кандыдатаў.

Пад бурныя воплескі зьезд абраў ганаровымі членамі Цэнтральнага савету т. т. **Сталіна, Молатава, Варашылава, Уншліхта і Гамарніка.**

13-га зьезд віталі ад імя па-завайскавікоў т. т. **Баруўскі і Міхаленка.**

У гэты дзень адбылася нарада сакратароў раённых саветаў Асоавіяхіму, а пры ЦК ЛКСМБ—нарада камсамольцаў-дэлегатаў зьезду.

Першы пленум Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму БССР, абраў прэзыдыум з **17** членаў і **6** кандыдатаў. Пленум адпагалосна абраў старшынёю ЦС старшыню СНК БССР **т. Галадзеда.** Першым намесьнікам абраны **тав. Дрылёнак,** другім намесьнікам—**рабочы заводу «Камунар» т. Пліман.**

Паведамленьні

СЁНЬНЯ:

—Дом Камасьветы. У 19 гадз., пак. № 3 (уваход з вул. К. Маркса)—**групавая кансультацыя для газэтных работнікаў на тэму:** «Нізавы друк у змаганьні за транспарт». На кансультацыю павінны зьявіцца члены рэдкалегій насьценгазэт і шматтыражак і рабкоры.

У 19 гадз.—вечар, прысьвечаны выпуску першапачатковых партшкол. Білеты на школах.

—Культпроп Менгаркому КП(б)Б паведамляе, што сёньня, у 19 гадз., у клюбе Кам. Асьветы адбудзецца вечар, прысьвечаны выпуску слухачоў першапачатковай партыйнай школы першага скліканьня. Заг. партшкол і прапагандыстам, якія кіруюць групамі на ўсіх прадпрыемствах, патрэбна зьявіцца ў культпроп гаркому і атрымаць білеты для сваіх слухачоў.

—Парттройка Менскай гар. КК выклікае на 14 лютага, у 6 з пал. гадз. веч. наступных т. т.: Эстрына І. Л. — яч. ДПУ, Шчупкага — яч. БДУ, Мурашка — яч. ЦК КП(б)Б, Самусевіча — рабфак, Казлова А. Р. — гута, Шыманскага — малы рамонт, Сіняўскага — экспл., Рудэрмана, Назарчука — гарб. «Бальшавік», Кадзякова — БДУ, Бераловіча, Клімава, Пліска — Камвуз, Лукашонка — ДПУ, Перавозчыкава — Белдзяржбуд, Вялікова—міліцыя, Казлова — НКЮ, Багдановіча — каап. «Зямляроб», Мароза — нарсувязь, Левіна — «Полымя рэвалюцыі», Арлоўскага — зав. «Камунар», Гельмановіча — абутк. майст., Раткевіча, Мацукевіча — МББ ч. Памяняныя т. т.: запрашаюцца для прыняцьця ўдзелу пры разглядзе іх спраў. Таксама запішаюцца зьявіцца сакратары тых ячэек, дзе гэтыя т. т. лічацца на вучоце.

Менская Гар. КК КП(б)Б просіць т. Драздова Язэпа Сямёнава (п. б. № 0818932), працаваўшага ў крамах Мен. ЦРК, не выяжджаючы з месца работы, паведаміць свой адрас. Такая-ж просьба адносіцца да ўсіх т. т., якія ведаюць месца работы або жыцьця т. Драздова.

— З 15 па 22 лютага праводзіцца перарэгістрацыя членаў т-ва ВМД і прыём новых. Перарэгістрацыя будзе праводзіцца ў канц. Дому Камасьветы з 17 да 20 гадз. штодзенна.

— **НКАЗ.** 15 лютага 1931 г. у 19 з пал. гадз.—чарговая гутарка па рацыяналізацыі аптэчнай справы (праф. Анішчанка). Яўка ўсіх заг. аптэк і санмагаў абавязкова. Запрашаюцца ўсе іншыя працаўнікі аптэк.

— **Клюб саўгандальспужчык.** 14 лютага, у 20 гадз. адбудзецца першы канцэрт струннага музгуртка. Заняткі у гурток працягваецца пры канц. клюбу.

Адказны рэдактар
Л. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная канторa
Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-30	Начны рэдактар	6-47
Сакратар	10-74	Галоўная кантора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі
(з дарожным дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	1 р
3 мес.	3 р
6 мес.	6 р
12 мес.	12 р

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншага гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьля тэксту—у два разы дарожэй. Кантрамарка і рахунак выдаваецца № 52/100301 у Дзяржбанку.

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗЬЯЗДА" Менск, Савецкая 63, 2-ы паверх. Тэл. 7-31.

Згубленыя і украдзеныя дакументы

пічыць несапраўднымі

Паяв. кн. Клясьніцк. спаж. т-ва Перай Е. Я., 1200; пальв. кн. МІЦРК Агейчык В. Л., 1201; вайск. кн. Піліпенскага Ф. 1202; кон. карт. № 1792 Жытк. РВК Папярэвіча Е. С., 1203; кон. карт. Чэрв. РВК Суша І. Е., 1204; вайск. біл. Луган. ваенкам. Камарова А. Д., 1205; вайск. біл. Рагач. ваенк. Бухарова В. Д., 1206; наш. № 131 Смал. РВК Эліяшберга П. І., 1207; вайск. кн. Хадарына В. П., 1208; кон. карт. Іван. РВК Карыцкага А. Г., 1209; паяв. кн. № 2363 Бятом. спаж. т-ва Насеньнік Г. М., 1210; ас. кн. № 3 Нараўл. РВК Смыкоўскага С. С., 1211; паяв. кн. № 21 Прыямін. ЦРК Стасевіча Е. П., 1212; чл. біл. № 2366 с. працасьв. Дамброўскай Г., 1213; каманд. пасьв., ас. пасьв. БМЖС Кудрыцкага Я., 1214; каап. кн. № 1110 Стараж. каап. т-ва Леўкаўца В. Н., 1214; вайск. кн. Гутковіча Р. Ф., 1215; ас. пасьв. № 6019 Жырэвіча А. Я., 1216; вайск. кн. Захаранка А. П., 1217; вайск. біл № 817 Навіцкага У. Д., 1218; вайск. біл. Навіцкага П. К., 1219; чл. біл. № 101754 Гурэвіча І., 1221; чл. біл. № 695 Тур. спаж. т-ва Кірэнчука М. К., 1222; вайск. біл. Карполіца А., 1223 ;мэтр. вып. Фельдман Х. Л., 1224; чл. біл. № 12272 Барыс. с. РЗІ Ляўданскага А. М., 1225; чл. біл. № 159321 с. СГЛР Сьвінарскага Н. Р., 1226; чл. біл. № 7910 с. працасьв. Хецдогай Е. З., 1227; пасьв. аб сканч. Талач. 7-годкі Краера Я. П., 1228; кон. карт. Бічукова В. Д., 1229; вайск. кн. Новікава Ф. А., 1230; чл. біл. с. працасьв. Марозава П. М., 1231; пэнс. кн. Магіл. страхк. Пухоўскага В. І., 1232; кон. карт. № 3399 Бярэз. РВК Жэжкі А. В., 1233; парт. біл. № 0802549 Жолудзя М. М., 1234; кон. карт. Сусоева Ф. В., 1235; мэтр. вып. Смал. міл. Рашчынскай В., 1236; кон. карт. Астр.-Гар. РВК калгасу «Чуе Сацыялізм», 1237; мэтр. вып. Круск. ЗАГС'у Бізянкова В. М., 1238; вайск. біл. Мідзькова Д. Я., 1239; кон. карт. Лучальск. вайск. ст. Вініка Н. Н., 1240; вайск. біл. Яцэвіча Д., 1241; чл. біл. с. МСП Сулагубава А. Д., 1242; вайск. біл. Дрыбін. РВК Кавалёва М. А., 1243; вайск. біл. Чавуск. вайск. ст. Арэова М. С., 1244; камс. біл. № 136719 Сіфонова А. 1245; вайск. біл. Расон. вайск. Артэменка П. П., 1246; вайск. РВК Аўхімовіча Я. І., 124 Бярэз. міл. Каваленкі З. біл. Абрамчыка С. А, 1249; Барыс. міл. Сідаровіч Я. Л., 1250; кн. № 615 Рашоткі Я. Д, 1251; парт. біл. № 1088266, пасьв. ас. № 4-д Данілевіча Н., 1252; пасьв. верх. с.-с. Камель М. Н., 1253; каан. кн. № 1978 Тур. спаж. т-ва Санец М. Б., 1254; чл. біл. № 6/42795 Аронціна З. Л., 1255; пальв. кн. Чавуск. спаж. т-ва Крупская Я., 1256; вайск. біл. Рубаніка Т. С., 1257, квіт. № 83950 Тур. Лесбелу Маркевіча І. А., 1258; пальв. кн. № 2835 Койд. спаж. т-ва Шыцкога Г. П., 1259; кон. карт. № 1541 б. Хутар. ВВК Мартышенкі Н. С., 1260; чл. біл. № 49441 с. РЗІ Габрыеля Ф. Ф., 1261; прац. кн. Мухасд. с.-г. т-ва Гузмана К., 1262; кон. карт. № 2249 Нараўлянск. РВК Чарайкоўскай Г., 1263; каан. кн. № 642 Нараўлянск. спаж. т-ва Вуракоўскага І. Д., 1264.

Сёньня, 14 лютага. Паяв для саюзу саўгандальслужачых. Пач. а 8 гадз.

Беларускі другі дзяржаўны тэатр
В. Кіршон.
РЭЙКІ ГУДУЦЬ
Пьеса ў 5 дзеях. 12 абразоў.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Вялікі гукавы фільм справа
13 ДЗЁН «ПРАМНАРТЫ»
Звыш праграмы ХРОНІКА САЮЗКІНО № 1 за 1931
Каса—з 5 г.—Пачатак сэансаў: 7 г. 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.

Кіно-тэатр „Культура"
Новы фільм вытворчасьці Саюзкіно (Трастбелдзяржкіно)
Сапраўднае жыцьцё
Пач. сэансаў: у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 гад. 20 мін. Каса—5 гадзін

Кіно „Інтэрнацыянал"
Мастацкі фільм нямец. вытворчасьці
ГОРНАЯ БАЛЯДА
Пач. 1 сэансу ў 6 г.—Каса—з 4 г. 30 хв.

КІНО „Пралетары"
Мастацкі фільм паводле раману ШОЛОМ-АЛЭЙХЭМА
МАБУЛ (Крывавы патоп)
Драма ў 9 частках.
Пач. 6 г., 7 г. 31 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 4 гадз.

Кіно „Юны Піянэр"
Эпізод з грамадзянскай вайны паводле аповесьці Д. Фурманава
МЯЦЕЖ
у 6 частках.
Пач. сэансаў з 1 г. дня. Каса з 12 г.

КІНО „СПАРТАК"
У фільме ПЭР ЛЕЛІНСКІ
Закройшчык з Таржка
намедыя ў 6 частках.
Пач. 6 г. 30 м., 8 г., 9 г. 30 м. 11 г.
Каса—з 5 г.

БЕЛДЗЯРЖСТРАХ
перамясьціўся
ў будынак был. Дзяржбанку
Савецкая, 59, 2 паверх.
Па пытаньнях страхаваньня жыцьця
зварачацца ў гал. кіраўніцтва Ашчадкасамі БССР, Савецкая 43.

МЕНСКІ ДАШКОЛЬНЫ ПЭДТЭХНІКУМ
абвяшчае
НАБОР НА 1-ШЫ КУРС
ВЕСНАВОГА СЭМЕСТРУ.
Прымаюцца скончаўшыя сямігодку (для рабочых і дзяцей рабочых асьвета можа быць зьмешана да 6-ці груп). Да заявы неабходна дадаць наступныя дакументы: аб асьвеце, узросьце, праве голасу, здароўі, сацыяльным становішчы і засьведчаная анкета.
Заявы прымаюцца ў канцылярыі тэхнікуму (Савецкая, 144) да 10-га сакавіка 1931 г.
Дырэктар тэхнікуму ОШАРАВА.

15 ЛЮТАГА г. г., у памяшканьні БЕЛДЗЯРЖТЭАТРУ адкрываецца
III Усебеларускі настаўніцкі зьезд.
Парадак дня зьезду:
1) Рэканструкцыйны пэрыяд і задачы настаўніцтва.
2) Вынікі і пэрспэктывы культурнага будаўніцтва БССР.
3) Камсамол у культурным будаўніцтве БССР.
4) Чарговыя задачы саюзу працасьветы па рабоце сярод настаўніцтва.
Адкрыцьцё у 6 гадзін вечара.
Рэгістрацыя дэлегатаў і выдача мандатаў адбываецца ў ДОМЕ АСЬВЕТЫ (Камуністычная, 19) штодня з 9 гадз. раніцы да 12 гадз. ночы.

МЯСЦКОМ БДВ
склікае на 16 лютага ў 7 гадзін вечара ў памяшканьні праўленьня БДВ (Савецкая, 59)
АГУЛЬНУЮ НАРАДУ МАСТАКОЎ і ПІСЬМЕНЬНІКАЎ,
па пытаньнях
мастацкага афармленьня кнігі.
МЯСЦКОМ.

ВЫШАЎ З ДРУКУ,
разасланы падпісчыкам і паступіў у продаж
№ 10-12 „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" № 10-12
ЗЬМЕСТ:
К. В. ГЕЙ. Аб выніках пленуму ЦК і ЦКК КП(б Б.
ХАЦКЕВІЧ. Ажыцьцяўленьне ленінскай нац. палітыкі ў БССР.
А. В. Палітычная сутнасьць беларускага нацыянал-дэмакратызму.
ДУНЕЦ. На адным з вучасткаў нац. работы.
ШЧАРБАКОЎ. Пытаньні культуры і асьветы на XIII зьезьдзе КП(б)Б.
ГАЛЧАРЫК. Беларускі навукова-дасьледчы інстытут сел. і лясн. гаспадаркі на службе ў беларускай кандрацьцеўшчыны.
КАНАПЛІН. Становішча на фронце тэорыі дзяржавы і права ў БССР і задачы таварыства марксыстаў-дзяржаўнікаў.
ГЕСЭН. Нацыянал-дэмакратычная гісторыя беларускай літаратуры.
Зьмест «Бальшавіка Беларусі» за 1930 г.
УМОВЫ ПАДПІСКІ на 1931 год.
на год —4 р. 20 к. | на 3 мес.—1 р. 05 к.
на паўгода—2 р. 10 к. | на 1 мес.— — 35 к.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА УСЮДЫ НА ПОШЦЕ.

За парушэньне пастановы НКПБ ад 7/I 31 г. № 1-65
ЗА НЕПАДАЧУ Ў ТЭРМІН ПЛЯНАВЫХ ЗАЯВАК
на патрэбнасьць рабсілы на 1931 г.
прыцягнуты да штрафу па 25 руб. кожны
1. Дырэктар зав. „Полымя рэвалюцыі",
2. „ швэйн. ф-кі „8 сакавіка",
3. „ „ „ імя Крупскай,
4. Фармазавод,
5. Менбудаб'яднаньне, Кісялёў.
У выпадку далейшага затрыманьня падачы заявак, адміністрацыя будзе прыцягнута да суровай адказнасьці.

Даводзіцца да ведама ўсіх былых шахцёраў,
якія раней працавалі ў горнай прамысловасьці і зараз жывуць — у Беларусі, аб тым, што —
АБ'ЯДНАНЬНЕ „УГОЛЬ"
ВЯРБУЕ СТАРЫХ ШАХЦЕРАЎ
ДЛЯ РАБОТЫ У ШАХТАХ ДАНБАСУ
на наступных умовах:
рабочым, даўшым згоду паехаць на работу ў шахты Данбасу, атрымліваюць пранязныя грошы па чыгунцы, сутачныя для харчаваньня ў дарозе па 2 р. 50 к. у дзень за кошт Аб'яднаньня «Уголь». На месцы работы рабочым шахцёры забясьпечваюцца інтэрнатам і пасьцельнымі прыладамі, а таксама харчаваньнем праз ЦРК і сталовую.
НОРМА ХАРЧАВАНЬНЯ
для падземных рабочых наступная: хлеба—1.000 грам, мяса 200 грам, алею 1.000 гр., круп 2.000 гр., цукру 1.200 гр., гаспадарчага і туалетнага мыла на 1 каваку, а таксама і другія прадукты.
Выдаюцца прамтавары і прэмія прамтаварамі за перавыкананьне нормы выпрацоўкі.
Спэцвопратка выдаецца на існуючым калдагаворы. Асобы, жадаючыя паехаць на работу ў шахты Данбасу, могуць зварачацца да вярбоўшчыкаў Аб'яднаньня «Уголь» ці да райінспэктароў працы таго раёну, дзе робіцца вярбоўка.
Па ўсіх пытаньнях просьба зварачацца ў Наркамправы БССР да Упаўнаважанага Аб'яднаньня «Уголь»
Наркамправы БССР
Упаўнаважаны Аб'яднаньня «Уголь».

15 лютага ў 7 гадз. веч. сац.-быт. сэкт. ЦСПСБ сумесна з рэдакцыяй газэты „Рабочай" склікае
ШЫРОКУЮ НАРАДУ
па пытаньні
аб працы зак